«Чалавечая» арыфметыка на Бярозаўшчыне

Беларус, які скарыў нябёсы

Сюрпрызы тэатральнай восені

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЖНІЎНЯ 2015 г. СЕРАДА № 162 (28020) Кошт 2000 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

СТАР. 3 СТАР. 6

ЛАГОЙСКІЯ ДОЙЛІДЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛЮБЫ ШЛЯХ ДЭБЮРАКРАТЫЗАЦЫІ — ГЭТА ПРАВІЛЬНЫ ШЛЯХ

Але ўсюды ёсць межы, якія нельга пераходзіць

Такі пункт гледжання выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, заслухоўваючы даклад па пытанні ўдасканалення парадку ліцэнзавання асобных відаў дзейнасці і ўзмацнення кантролю ў гэтай сферы.

У час даклада абмяркоўваўся праект указа «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка дэталёва спыніўся на кожнай з прапанаваных нормаў, патрабуючы абгрунтаваць іх эфектыўнасць і мэтазгоднасць. Сярод запланаваных змен — зрабіць дзеянне ліцэнзій бестэрміновым замест цяперашніх 5-10 гадоў. Распрацоўшчыкі ўказа прапанавалі таксама істотна скараціць колькасць дакументаў, неабходных для іх атрымання, даць магчымасць накіроўваць па пошце ці ў электронным выглядзе заяўкі ў орган, які выдае ліцэнзіі.

«Калі сапраўды дэбюракратызуецца сістэма і будуць прыбраныя лішнія адміністрацыйныя бар'еры, якія перашкаджаюць, гэта нармальна і гэтым шляхам пойдзем», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён запатрабаваў, каб «якасць і бяспека паслуг і тавараў былі захаваныя, і гэта — бар'ер у выглядзе ліцэнзавання».

«Любы шлях дэбюракратызацыі — шлях правільны, але ўсюды ёсць межы, якія мы ні ў якім разе ў цяперашняй сітуацыі, на цяперашнім этапе развіцця не павінны перайсці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў, што ні ў якім разе нельга дапусціць паўтарэння сітуацыі, якая адбылася ў холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў», калі былі парушаны прынцыпы бяспекі. «Тут спрашчацца і практыкавацца нельга», — сказаў Прэзідэнт. На яго думку, пытанням бяспекі людзей на вытворчасці павінна надавацца асаблівая ўвага.

Аляксандр Лукашэнка ўхваліў прапанову ўстанавіць больш жорсткія патрабаванні і ўмовы для ажыццяўлення судова-экспертнай дзейнасці, а таксама ў галіне атамнай энергетыкі і рыэлтарскіх паслуг.

Па выніках нарады праект указа быў накіраваны на дапрацоўку, у тым ліку для таго, каб зняць некаторыя спрэчныя моманты юрыдычнай тэрміналогіі, зрабіўшы яго больш даступным для разумення бізнесу.

■ Педсавет

ПЕДАГОГ — ПАВІННА ГУЧАЦЬ ГОРДА

«Кажуць, што прэстыж педагагічнай прафесіі трэба ўзнімаць. А я лічу, што ён залежыць найперш ад саміх педагогаў. І калі вы самі будзеце ставіцца да сваёй прафесіі з любоўю і трапятаннем, то нікому не дазволіце яе зневажаць, — падкрэсліла, звяртаючыся да ўдзельнікаў жнівеньскага форуму педагагічных работнікаў сталіцы, намеснік прэм'ер-міністра краіны Наталля КАЧАНАВА. — Прафесія педагога павінна «гучаць горда» ў нашым грамадстве».

Удзел у форуме ўзялі больш за 500 педагогаў. Таксама на мерапрыемства былі запрошаны **міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў і старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ**.

— Увага, якая ўдзялялася і з боку кіраўніка дзяржавы, і з боку ўрада педагагічным кадрам, прынесла свой плён: сёлета падчас прыёмнай кампаніі педагагічныя ВНУ вельмі хутка ўкамплектаваліся. Важна, што на педагагічныя спецыяльнасці прыйшлі больш моцныя абітурыенты, — паведаміла віцэ-прэм'ер, якая ўзначальвала сёлета Дзяржаўную камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў.

Тая акалічнасць, што ў сталіцы ў новым навучальным годзе адкрываецца вялікая колькасць профільных класаў, не можа не радаваць. Але Наталля Качанава папярэдзіла гарадскія ўлады: фармалізм у гэтым пытанні недапушчальны. Профільныя класы павінны стварацца толькі там, дзе дазваляе матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы адукацыі і дзе ёсць моцны кадравы склад.

СТАР. 2

■ Выбары-2015

ПРА КАНДЫДАТАЎ РАСКАЖА... СМАРТФОН

Мабільную праграму да выбараў стварыў 18-гадовы студэнт БДУ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларускае тэлеграфнае агенцтва сумесна распрацавалі мабільную праграму «Выбары-2015». Яна разлічана, перш за ўсё, на маладзёжную аўдыторыю і на яе інфармаванне аб галоўным выбарчым працэсе, які чакае Беларусь у кастрычніку.

«Мы хочам, каб моладзь ведала пра выбары калі не ўсё, то даволі шмат, каб арыентавацца ў гэтай няпростай тэме. Важна, каб інфармацыя, якую моладзь чэрпае з інтэрнэту, насіла канструктыўны характар», — адзначыў падчас афіцыйнай прэзентацыі прыкладной праграмы **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**. Ён дадаў, што стварэнне такой праграмы — яшчэ адзін уклад у агульную справу: «Мы будзем вельмі рады, калі гэтая мабільная праграма сапраўды будзе служыць для аб'яднання моладзі, каб маладыя людзі актыўна, у тым ліку 11 кастрычніка, праявілі сябе, прыйшлі на выбарчыя ўчасткі і прагаласавалі за выбранага імі кандыдата ў Прэзідэнты».

На думку **генеральнага дырэктара БелТА Дзмітрыя ЖУКА**, асноўная задача новастворанай праграмы — зрабіць інфармацыю аб выбарах даступнай і зручнай для ўсіх. «Сёлета галасаваць будуць тыя, хто нарадзіўся ўжо ў суверэннай Беларусі. Каб адпавядаць патрабаванням моладзі, з'явілася ідэя стварыць гэтую праграму», — сказаў ён. Кіраўнік агенцтва назваў пакаленне, якое падрасло і ўпершыню прыйдзе на выбары, «пакаленнем вялікага пальца». Бо маладыя людзі ледзь не ад нараджэння знаёмыя з гаджэтамі і прывыклі атрымліваць інфармацыю з экранаў мабільных тэлефонаў ці планшэтаў.

Фота БЕЛТА.

СТАР. 2

■ Фінансы

Абмежаванняў па продажы валюты банкі не плануюць

Але спецыялісты раяць не гуляць на курсах, а рабіць доўгатэрміновыя ўклады

На думку намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргея КАЛЕЧЫЦА, тая дынаміка, якая назіраецца сёння на валютным рынку, — гэта гнуткая рэакцыя беларускага фінансавага рынку і банкаўскай сістэмы на ўзрослую валацільнасць (зменлівасць) сусветнай эканомікі. Усе гэтыя працэсы маюць фундаментальную аснову і з'яўляюцца вынікам кан'юнктурных і нават спекулятыўных фактараў. Да фундаментальных прычын адносяцца працяглыя трэнды на зніжэнне коштаў энерганосьбітаў. Шасцігадовы мінімум па цане на нафту быў пяройдзены ў апошнія дні. Кошт на нафту складае парадку 43 доларaў за бараль. Да іх сёння магчыма дадаць і каротказтэрміновыя змены курсаў у асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі. Сусветныя працэсы аказваюць уплыў на эканоміку краіны і на валютны рынак у цэлым. На думку многіх экспертаў, прагназваць, што будзе з беларускім рублём, сёння цяжка, але пэўныя чаканні ўсё ж ёсць.

ЁСЦЬ ПОПЫТ? БУДЗЕ ПРАПАНОВА

Нягледзячы на паслабленне беларускага рубля ў дачыненні да замежных валют, прадстаўнікі буйных банкаў краіны заявілі аб тым, што не маюць намер уводзіць абмежаванні і гатовыя забяспечваць абменныя пункты замежнай гатоўкай. **Першы намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Генадзь ГАСПАДАРЫК** падкрэсліў, што, калі павысіўся попыт, аб'ёмы продажу валюты ў аддзяленнях узраслі прыкладна ў 5 разоў. «Я не магу сказаць, што ў нас напярэдадні ва ўсіх падраздзяленнях працягу ўсяго працоўнага дня была наяўная валюта. Былі збоі, бо ёсць тэхнічныя пытанні забеспячэння і падмацавання абменных пунктаў. Сёння мы вырашаем гэтыя пытанні. У наступныя дні ўсе нашы абменныя пункты будуць падмацаваныя ў тым аб'ёме, у якім трэба», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу **намеснік старшыні праўлення Пріорбанка Сяргей ШЫШОЎ** зазначыў, што ўсе філіялы і абменныя пункты банка працавалі ў звычайным рэжыме.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША размесцяць у Еўропе знішчальнікі F-22

Злучаныя Штаты ў найбліжэйшы час разгорнуць у Еўропе групоўку знішчальнікаў F-22 для падтрымкі ўсходнееўрапейскіх саюзнікаў па НАТА, устрывожаных дзеяннямі Расіі ва Украіне. Пра гэта заявіла міністр ваенна-паветраных сіл ЗША Дэбора Джэймс. Міністр не дала падрабязнай інфармацыі аб канкрэтнай колькасці самалётаў, даце або месцы разгортвання групоўкі. Як адзначаецца, сёння знішчальнікі F-22 выкарыстоўваюцца амерыканцамі для выканання баявых аперацый у Іраку і Сірыі супраць баевікоў групоўкі «Ісламская дзяржава». На мінулым тыдні выданне The Fiscal Time пісала, што Вашынгтон збіраецца адправіць у Еўропу 12 рэактыўных самалётаў-штурмавікоў А-10, якія павінны спісаць і замяніць на бамбардзіроўшчыкі B-1 і F-35. У паведамленні адзначалася, што самалёты ўзмоцняць групоўку НАТА ў Еўропе на выпадак «агрэсіі» з боку Расіі.

Эстонія адгародзіцца ад Расіі двухметровай сцяной

Дэпартамент паліцыі і памежнай аховы Эстоніі збіраецца пабудаваць сцяну на мяжы з Расіяй. Як паведамляе Postimees, сама меней дзве трэці сухапутнай часткі мяжы з РФ з мэтай прадухілення яе парушэнняў будуць абсталяваны агароджай вышынёй два з паловай метры. Работы па тэхнічным узмацненні мяжы, па звестках выдання, пачнуцца ў краіне ў 2018 годзе, на іх выдаткуюць 71 млн еўра. Эстонія стала другой краінай у Прыбалтыцы, якая заявіла, паведамляе прэса, пра намер адгарадзіцца сцяной ад Расіі. У пачатку жніўня пра аналагічныя планы заяўлялі ўлады Латвіі.

У Новай Зеландыі знайшлі шматмільярдныя запасы золата

Геафізікі з ЗША і Новай Зеландыі выявілі ў падземных вадаёмах востраваў Паўночны буйныя запасы золата і серабра. Усяго знойдзена шэсць буйных радовішчаў каштоўных металаў, размешчаных у раёне вулканічнай зоны Таупа. Паводле ацэнак навукоўцаў, золата ў радовішчах змяшчаецца больш за 20 тысяч частак на мільярд, а серабра — больш за 2 тысячы. Гэта дазваляе, у выпадку арганізацыі здабычы каштоўных металаў, атрымліваць да трох мільярдаў доларaў у год ад здабычы золата і 3,5 мільярда — ад серабра.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У Еўропе працягваюцца сутычкі з мігрантамі

Сотні мігрантаў перакрылі дарогу ў Мілане і пабіліся з паліцыяй, паведамляюць інфармагенцтвы. Інцыдэнт адбыўся ў панядзелак 24 жніўня. Незадаволенасць бежанцаў выклікалі ўмовы ўтрымання і працяглыя бюракратычныя працэдуры. На іх думку, яны занадта доўга чакаюць дазволу на працу. Перакрыўшы адну з ўязных дарог у горад, каля 300 мігрантаў, пераважна з Афрыкі, скандіравалі: «Дакументы, дакументы!» Сілавікі былі вымушаны перапраўіць мігрантаў назад на тэрыторыю арганізаванага для іх лагера. Праблемы з мігрантамі выклікаюць у Італіі — як і па ўсёй Еўропе — палітычныя супярэчнасці. Яшчэ раней сутыкненні нямецкіх правых з паліцыяй адбыліся каля лагера мігрантаў Хайдэнаў непадалёк ад Дрэздэна. Раніцай суботы, 22 жніўня, сотні пратэстоўцаў акружылі лагер для бежанцаў і сталі кідаць у паліцэйскіх камяні і бутэлькі. У выніку 31 сілавік атрымаў раненні і праваахоўнікі былі вымушаны прымяніць слязісты газ.

КАРАТКА

Каля Br7,9 млрд выдзелена з бюджэту Мінска на выплату аднаразовых сацыяльных дапамог для шматдзетных сем'яў да пачатку 2015/2016 навучальнага года.

Рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», арганізаваная напярэдадні Дня беларускага пісьменства, стартуе 2 верасня ў Мінску.

У Беларусі зменены пералік захворванняў і станаў, пры якіх проціпаказана здача крыві і яе кампанентаў. У новы спіс, сярод іншых, упершыню ўключана такое часовае проціпаказанне, як эндаскапічнае даследаванне з выкарыстаннем гібкіх эндаскопаў (дзейнічае на працягу 6 месяцаў).

У Мінску з 25 жніўня ўзмоцнены кантроль за цэнаўтварэннем і прымяненнем гандлёвых надбавак суб'ектамі гаспадарання сферы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання.

Госці фолк-фестывалю «Камяніца» ўбачаць этнаграфічную містэрыю ў пастаноўцы лідара групы «Троіца» Івана Кірчука.

■ Чулі?

КВАС НЕ ДЛЯ ВАС

Магчыма, у хуткім часе з вуліц сталіцы знікне «бочкавы» квас

У савецкія часы, як толькі пачыналася цёплае надвор'е, на вуліцах вялікіх і маленькіх гарадоў з'яўляліся бочкі з квасам і півам. Каля іх стваралася асобная, непаўторная атмасфера: стоячы ў вялікіх чэргах, можна было даведацца апошнія навіны, абмеркаваць надвор'е, наслухацца розных чутак.

Спажывалі напоі павольна, смакуючы кожны глыток, нікуды не спяшаліся, а пасля яшчэ і па дабаўку станавіліся. Сёння такога ўжо няма. На вуліцах яшчэ дзе-нідзе сустракаюцца прыкметныя жоўценькія бочкі з квасам, але купляюць яго ўжо без ажыятажу. Ды і адметны паход «па квас», які калісь быў як рытуал, таксама знік. Стаў штодзённасцю... Але ў хуткім часе пакаштаваць квасу з бочкі, пэўна, зусім не атрымаецца: санслужба Мінска мае намер ліквідаваць гэты вулічны гандаль.

Сёння ў сталіцы ўжо не вырабляюць бочкавы квас — для продажу яго прывозяць са Смалявіч і Фаніпаля. Прадаюць на вуліцах горада менавіта жывы квас — той, які вырабілі з натуральных інгрэдыентаў, без усялякіх там кансервантаў, таму і тэрмін прыдатнасці ў яго кароткі (некалькі дзён). Калі не прададуць — то ўсё, пішы прапала, прадукт псуецца. Але ў гарачыя дзянькі гандаль ідзе жвава.

Хтосьці купляе кубачак ці куфаль, а нехта бярэ пару бутэлек. А напаўняецца розная тара ўжо не з аўтацыстэрны — гэта састарэлы спосаб продажу. Зараз квас льецца акуратна з кегі. Кега — гэта ўнікальная металічная пасудзіна. На заводзе яна герметычна закрываецца коркам, і ўжо напоўніць без спецыяльнага прыстасавання яе немагчыма.

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

ШЫРОКАЯ СФЕРА ІНТАРЭСАЎ

Іран зацікаўлены ў развіцці эканамічных стасункаў з нашай дзяржавай

Патэнцыял супрацоўніцтва паміж нашай краінай і Іранам вельмі вялікі. На гэтым быў зроблены акцэнт падчас сустрэчы намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктара ГУМІНСКАГА і кіраўніка групы дружбы Сходу ісламскага савета Ірана па супрацоўніцтве з Беларуссю Алі КАІДЗІ.

— Дэлегацыя Ірана знаходзіцца ў нас па запрашэнні беларускага боку, — паведаміў Віктар Гумінскі. — Хачу адзначыць, што традыцыйна сяброўскія стасункі паміж краінамі, нягледзячы на санкцыйную палітыку, якую праводзіць Захад у дачыненні да Ірана, не спыняліся. Сёння, калі дасягнута пагадненне паміж Іранам і шасцёркай пасярэднікаў па іранскай ядзернай праграме, у нас з'яўляюцца новыя магчымасці для далейшага ўсебаковага развіцця адносін з Ісламскай Рэспублікай Іран. Патэнцыял паміж нашымі краінамі для развіцця такога супрацоўніцтва велізарны.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу, што таварааварот паміж дзвюма краінамі, нягледзячы на санкцыі, летась склаў больш за 100 мільёнаў долараў. У аб'ёме тавараабароту пераважае беларускі экспарт — Іран зацікаўлены ў гандлі з намі па многіх пазіцыях.

— Падчас сустрэчы з групай дружбы Сходу ісламскага савета Ірана мы абмеркавалі, як зрабіць усё неабходнае з боку парламентаў для паглыблення і развіцця ўсебаковага супрацоўніцтва на ўсіх узроўнях, — адзначыў Віктар Гумінскі.

Кіраўнік групы дружбы з нашай краінай у іранскім парламенце Алі Каідзі ў сваю чаргу адзначыў, што Іран зацікаўлены ў актывізацыі эканамічных стасункаў з нашай дзяржавай.

— Беларусь займае асабліва месца ў нашай знешняй палітыцы, таму мы вельмі стараемся развіваць нашы стасункі ва ўсіх сферах, асабліва ў сферах эканомікі, культуры, новых тэхналогій, — заявіў іранскі парламентарый. — У стасунках Ірана і Беларусі ёсць вялікі патэнцыял — і для экспарту, і для імпарту. Нашы эканамічныя стасункі могуць быць узаемадапаўняльнымі. Мы — краіны, зацікаўленыя ва ўмацаванні і развіцці нашых узаемаадносін. Адной з галоўных тэм сустрэчы мы лічым запрашэнне старшыні нашага парламента спадара Алі Ларыджані ў адрас старшыні Палаты прадстаўнікоў наведаць Ісламскую Рэспубліку Іран.

* * *

Сучасны Іран прытрымліваецца незалежнага знешнепалітычнага курсу і выступае за ўсебаковае раўнапраўнае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. Дыпламатычныя адносіны з нашай краінай былі ўстаноўлены ў 1993 годзе. Паміж Беларуссю і Іранам дасягнуты высокі ўзровень палітычных сувязяў. Што да эканамічнага супрацоўніцтва, то шэраг іранскіх кампаній, перш за ўсё «Кейсон» і «Дзідас», займаюцца распрацоўкай і рэалізацыяй інвестыцыйных праектаў у нашай краіне. Гэта будаўніцтва шматфункцыянальнага гатэльна-дзелавога комплексу «Магніт Мінска», стварэнне транспартна-лагістычнага комплексу «Прылессе» ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск», будаўніцтва шматфункцыянальнага грамадска-дзелавога і гандлёва-сэрвіснага комплексу «Чэрвеньскі».

Надзея ЮШКЕВІЧ, *yushkevich@zviazda.by*

■

ПЕДАГОГ — ПАВІННА ГУЧАЦЬ ГОРДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На думку віцэ-прэм'ера, школы павінны надаваць больш увагі прафарыентацыйнай рабоце. Несумненна, пасля 9-га класа ў выпускнікоў базавай школы павінны быць сур'ёзныя экзамены, каб у дзясятыя траплялі ўжо больш моцныя і матываваныя вучні — тыя, хто сапраўды жадае вучыцца. «Нікога не трэба цягнуць да атэстата аб заканчэнні сярэдняй школы за вушы, — дадала Наталля Качанава. — І ў вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны прыходзіць больш моцныя абітурыенты...»

Усяго ў школах і гімназіях сталіцы ў новым навучальным годзе адкрыюцца 394 дзясятыя класы, з іх 206 профільных. У профільных класах вучні змогуць выбраць 2-3 прадметы, якія будуць вывучаць на павышаным узроўні. Для навучання ў іх выпускнікі базавай школы ўпершыню праходзілі конкурсны адбор.

Намеснік прэм'ер-міністра таксама паведаміла ўдзельнікам форуму, што да 2020 года ў Беларусі плануецца пабудаваць 79 дзіцячых садкоў. Увядзенне новых аб'ектаў дасць магчымасць вырашыць праблему забяспечанасці месцамі ў дзіцячых садках. Да таго ж будуць развівацца альтэрнатыўныя формы — прыватныя дашкольныя ўстановы. Павялічыцца і колькасць груп кароткатэрміновага знаходжання дзяцей, якія таксама часта выратоўваюць бацькоў дашкольнікаў.

Наталля Качанава папрасіла кіраўнікоў устаноў адукацыі надаваць асаблівую ўвагу арганізацыі харчавання дзяцей. Падчас правядзення ў дашкольных установах Камітэтам дзяржаўнага кантролю праверкі арганізацыі харчавання там была выяўлена вялікая колькасць парушэнняў: у першую чаргу, размова ідзе пра недакладанні прадуктаў, выкарыстанне пратэрмінаваных. «Ніхто не павінен заставацца абыякавым у гэтым пытанні. Я прашу — паглядзіце, чым харчуюцца побач з вамі дзеці», — звярнулася да педагогаў Наталля Качанава.

Яшчэ адно актуальнае пытанне — выкананне настаўнікамі неўласцівых ім функцый і паперавытворчасць. «Настаўнікі павінны вучыць і выхоўваць. І выхаванне — такая ж неад'емная частка працы педагогаў», — падзялілася сваім бачаннем сітуацыі віцэ-прэм'ер. А што тычыцца папяровай бюракратыі, то адпаведныя ўказанні органы кіравання на месцах павінны былі атрымаць....

— Мы разаслалі строгія рэкамендацыі падпарадкаваным нам структурам. Каб яны не нагружалі нашых дарагіх настаўнікаў папяровай працай і неўласцівымі функцыямі, — пацвердзіў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Дзякуючы ўкараненню ў практыку «Электроннай школы» дакументаабарот ва ўстановах адукацыі істотна скароціцца.

У праект «Электронная школа» да 2017 года плануецца ўключыць установы агульнай сярэдняй адукацыі ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Сёлета яго ўвядуць у некалькіх буйных рэгіёнах краіны. Пілотны праект «Электронная школа» стартаваў у Мінску ў 2013 годзе. У ім прынялі ўдзел 12 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, пазней далучыліся яшчэ тры школы. У 2016 годзе электроннымі стануць усе сталічныя школы. Праект прадугледжвае ўкараненне анлайн-рашэнняў па прадастаўленні розных інфармацыйных сэрвісаў — такіх, як электронны журнал, дзённік, расклад заняткаў.

Закранаючы тэму адмены хатніх заданняў для школьнікаў (такая ініцыятыва была агучана нядаўна медыкамі), Міхаіл Жураўкоў падкрэсліў, што педагогі прытрымліваюцца іншай пазіцыі. Хатняе заданне з'яўляецца неад'емнай часткай вучэбнага працэсу і самастойнай работы вучня. «Нават мой сын-старшаклясник такую ідэю не падтрымаў», — прызнаўся ў гутарцы з журналістамі міністр.

— І фізіёлагі, і псіхолагі кажуць, што за апошнія 100 гадоў мозг чалавека не змяніўся, як не змянілася і колькасць інфармацыі, якую можа успрыняць наш мозг, тым больш мозг дзіцяці або падлетка. А вось аб'ёмы ведаў змяніліся... Раней мы лічылі, што чым больш інфармацыі ўкладзём у галовы школьнікаў, тым будзе лепш. Але гэта не так... Трэба думаць, чаму вучыць дзяцей і як іх вучыць. Сучасныя школьнікі ўжо не жадаюць, каб настаўнік, проста стоячы ля дошкі, транслюючы свае веды. Яны хочуць вучыцца актыўна. І мы павінны ім такую магчымасць даць».

Надзея НІКАЛАЕВА,
nikalaeva@zviazda.by

Абмежаванняў па продажы валюты банкі не плануюць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Былі цяжкасці з электронным банкінгам, але гэта быў тэхнічны збой сістэмы. Усе нашы філіялы і абменныя пункты працавалі з наяўнай валютай. Мы бачым сваю мэту — поўнае забеспячэнне насельніцтва грашыма, незалежна ад таго — беларускія рублі гэта ці замежная валюта. Аб'ём продажу валюты сапраўды павялічыўся. Калі мы параўнаем ліпень і жнівень, то ў ліпені гэта было 38 мільёнаў долараў, а ў жніўні — ужо 50 мільёнаў. Але мы гатовыя задаволіць усіх нашых кліентаў», — растлумачыў ён.

Як адзначаюць спецыялісты, сярэдні аб'ём куплі складае ад 80 да 100 долараў на чалавека. Пры гэтым насельніцтва не паменшыла аб'ёмы здачы валюты. Увогуле, прадстаўнікі банкаў лічаць, што напружанасць у сітуацыі на валютным рынку Беларусі ў хуткім часе будзе знята.

«Мы стабілізуем становішча на наяўным рынку, а Нацыянальны банк усімі неабходнымі захадамі зробіць гэта і на валютным рынку», — растлумачыў Генадзь Гаспадарык. Па словах Сяргея Шышова, сітуацыя ўжо змянілася: «Колькасць кліентаў, якія збіраліся канвертаваць свае ўклады, ужо паменшылася. Кліенту важна зразумець, што банк можа задаволіць яго пажаданні, выканаць свае абавязацельствы. Калі кліенты гэта адчуваюць, напружанне сыходзіць», — падкрэсліў ён.

ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ ЎКЛАДЫ БОЛЬШ ВЫГАДНЫЯ

На думку Сяргея Шышова, доўгатэрміновыя ўклады ў беларускіх рублях заўсёды больш выгадныя, чым спробы згуляць на курсавых ваганнях. Ён прывёў у прыклад разлікі, якія сведчаць аб тым, што незалежна ад ваганняў курсу беларускага рубля ў дачыненні да валюты выніковая прыбытковасць укладаў у рублях складае прыблізна 10% у год у валютным эквіваленце. «Ніхто з банкаў сёння не дае 10% гадавых у валюце для фізічных асоб. Нашы стаўкі — максімум 4,5%», — адзначыў ён. Акрамя таго, Сяргей Шышоў не бачыць вялікай неабходнасці ў цяперашняй сітуацыі ў павелічэнні працэнтных ставак па укладах у беларускіх рублях: «Гэта не мае вялікага значэння сёння. Нам трэба выхоўваць нашага кліента. Ёсць добрыя страхавыя праграмы, ёсць нашы фонды банкаўскага кіравання, гэта значыць, нам усё роўна трэба развіваць гэты інструмент, каб людзі ўкладвалі грошы на больш доўгія тэрміны. І чым раней нашы кліенты зразумеюць, што для іх выгадныя больш доўгатэрміновыя інвестыцыі, тым гэта будзе лепш і для іх, і для нас усіх. Мы не зможам уплываць на ўсю эканоміку, але калі будзем развіваць правільную культуру, то наяўнасць «доўгіх грошай» будзе даваць магчымасць ажыццяўляць больш сур'ёзныя інвестыцыі».

Таксама, па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Дзмітрыя КАЛЕЧЫЦА,** Нацыянальны банк Беларусі не плануе павышэння стаўкі рэфінансавання. «Нацбанк не плануе павышэння стаўкі рэфінансавання і стаўкі па іншых інструментах рэгулявання, паколькі мы лічым, што іх узровень знаходзіцца на досыць высокім рэальным значэнні. Нейкіх фундаментальных фактараў, якія б падштурхнулі нас на павышэнне, няма», — рэзюмаваў ён.

ІНФЛЯЦЫЯ НЕ ВЫЙДЗЕ ЗА ПРАГНОЗНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Таксама Дзмітрый Калечыц адзначыў, што інфляцыя па выніках года не павінна перавысіць запланаваныя 18%. «Зараз мы ўкладваемся ў гадавым вымярэнні — парадку 12,2% за ліпень, па жніўні з улікам той дынамікі, якая цяпер адбываецца на фінансавым рынку, некаторае павелічэнне мы, вядома, чакаем, але ў цэлым у рамках 18% мы мяркуем захаваць інфляцыйныя працэсы», — сказаў Дзмітрый Калечыц.

Ён адзначыў, што ўздзеянне на інфляцыйныя працэсы і на ўстойлівасць валютнага рынку ажыццяўляецца праз фактары попыту і грашовую масу. Цяпер параметры па шырокай грашовай масе не перавышаюць прагнозных паказчыкаў.

Дзмітрый Калечыц не выключае, што тая дынаміка абменнага курсу, якая цяпер складваецца, будзе аказваць сваё ўздзеянне на дынаміку шырокай грашовай масы. «Магчыма, гэта запатрабуе ўзмацнення нейкіх рычагоў уздзеяння на попытавыя фактары. Але тут ёсць сумесны рух і Нацыянальнага банка, і ўрада, і падтрымка з боку падаткова-бюджэтнай палітыкі ў частцы аптымізацыі ўнутранага попыту для дасягнення макраэканамічнай збалансаванасці і стабільнасці ў краіне», — канстатаваў спецыяліст.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

ПРА КАНДЫДАТАЎ РАСКАЖА... СМАРТФОН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сапраўды, галоўным **стваральнікам «Выбараў-2015»** выступіў 18-гадовы **Павел БАЦЫЛЕЎ**, які скончыў першы курс механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Па яго словах, у гэтым годзе ён упершыню будзе ўдзельнічаць у выбарах. Таму вырашыў пацікавіцца, дзе можна адшукаць інфармацыю аб кандыдатах у прэзідэнты і зразумеў, што адзінай крыніцы, зразумелай для яго, амаль што няма. Гэта і натхніла маладога чалавека, які да гэтага ўжо стварыў 4 праграмы для моладзі, на новую працу. Для таго, каб зрабіць «Выбары-2015», яму спатрэбіўся месяц.

У праграме можна адшукаць інфармацыю аб кандыдатах у прэзідэнты, апошнія навіны аб выбарчым працэсе, заканадаўчую базу па выбарах, прачытаць адказы на папулярныя пытанні, а таксама азнаёміцца з вынікамі галасавання. Для таго, каб зрабіць навінку больш інтэрактыўнай, у яе дадалі спецыяльны раздзел, прысвечаны конкурсу. «Ён праводзіцца сярод маладых выбаршчыкаў ва ўзросце ад 18 да 31 года. Яго асноўная задача — вызначыць найлепшую прапанову або ідэю да выбараў. Магчыма, гэта будзе эсэ пра ўдзел у выбарчай кампаніі. Арганізатары вызначаць трох пераможцаў, якія ў якасці прыза атрымаюць у падарунак планшэты», — паведаміла журналістам **Алеся ВІННІК, каардынатар работы Саюза моладзі ў інтэрнэт-прасторы.**

Пакуль што праграма прызначана для карыстальнікаў Android і знаходзіцца ў бясплатным доступе ў Google Play. У далейшым яе плануецца падладзіць і пад аперацыйную сістэму iOS.

Вераніка ПУСТАВІТ, *pustavit@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

Будзем працаваць з Аманам

Напярэдадні сталіцу наведала дэлегацыя дзелавых колаў Амана. Гэта першае сумеснае пасяджэнне беларускай і аманскай гандлёва-прамысловых палат. Абодва бакі спадзяюцца, што перамовы дазволяць прыйсці да стварэння ўзаемавыгадных праектаў. Бізнесмены Амана зацікавіліся ў супрацоўніцтве ў сферах фінансавых паслуг і інвестыцый, вытворчасці электронікі, выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі, здабычы і перапрацоўкі нафты і газу, вытворчасці велікагрузнай тэхнікі.

Старшыня беларускай гандлёва-прамысловай палаты, Міхаіл МЯТЛІКАЎ адзначыў, што наладжванне супрацоўніцтва з Аманам пачалося яшчэ ў 2010 годзе. «У Беларусь прыбыла дэлегацыя, якая прадстаўляе сектары эканомікі, звязаныя з інвестыцыямі і машынабудаваннем. Гэта тыя кампаніі, якія гатовы разглядаць набыццё беларускай прадукцыі. Акрамя таго, супрацоўніцтва з Аманам дазволіць наладзіць нам экспарт не толькі на яго ўнутраны рынак, але і на ўвесь рэгіён Аравійскага паўвострава», — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў.

Старшыня эканамічнага камітэта гандлёва-прамысловай палаты Амана Кайса Бэн МАХАМЕД АЛЬ-ЮСЭФ у сваю чаргу адзначыў, што асноўная мэта візіту прадстаўнікоў дзелавых колаў Амана заключаецца ў тым, каб вызначыць усе магчымыя напрамкі, у якіх дзве краіны могуць супрацоўнічаць. «Што тычыцца інвестыцыйнай дзейнасці Амана, то мы зараз рэалізуем шэраг праектаў, якія могуць быць цікавыя Беларусі. Адным з іх з'яўляецца стварэнне найбуйнейшага лагістычнага цэнтра ў нашым рэгіёне. Мы ж у сваю чаргу зацікаўлены ў прадукцыі беларускай цяжкай прамысловасці і хімічнай галіны», — растлумачыў старшыня эканамічнага камітэта гандлёва-прамысловай палаты Амана.

Ілья КРЫЖЭВІЧ, *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Будзь у курсе!

ПАДЗЕМКА — НА ЗІМНІ І ПЯТНІЧНЫ РАСКЛАД

З 27 жніўня мінскі метрапалітэн пераходзіць на зімні графік. У будныя дні інтэрвал руху па абедзвюх лініях у ранішні і вячэрні час пік (з 7 да 9 гадзін і з 16 да 19 гадзін) складзе дзве хвіліны. У «няпікавы» час саставы пойдуць з інтэрвалам ад 2,5 да 12 хвілін. Першыя цягнікі з канцавых станцый «Уручча» і «Малінаўка» адправяцца ў 5.32, а з «Магілёўскай» і «Каменнай Горкі» — у 5.33. Апошні састаў пакіне канцавыя станцыі ў 1.02. А яшчэ ўпершыню з 4 верасня плануецца ўвесці так званы пятнічны графік руху электрацягнікоў. У гэты дзень вячэрні час пік будзе пачынацца на паўгадзіны раней, чым звычайна — у 15.30.

Сяргей РАСОЛЬКА, *rs@zviazda.by*

■

■ Каментар да падзеі

КАРАВАН КІРУЕ НА СОЧЫ

Мінск падчас Форуму рэгіёнаў прадставіць больш за 20 прадпрыемстваў

Некалькі тыдняў застаецца да аднаго з самых стратэгічна значных мерапрыемстваў для беларускіх вытворцаў у прыватнасці і айчыннай эканомікі ў цэлым — Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які мае адбыцца 17-18 верасня ў Сочы. На ім будуць прадстаўлены ўсе вобласці нашай краіны, у тым ліку і горад Мінск. Пра тое, якім чынам наша сталіца праявіць сябе на ім, расказала Жанна БІРЫЧ, намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

«Мне прыемна адзначыць, што першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі быў праведзены ў чэрвені мінулага года менавіта ў Мінску, — гаворыць Жанна Эдуардаўна. — Тады ў ім узялі ўдзел звыш 180 чалавек з расійскага боку (было прадстаўлена 19 рэгіёнаў) і каля 120 чалавек — з беларускага».

Як адзначае Жанна Бірыч, другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Сочы 17-18 верасня будзе яшчэ больш маштабным. Бо «мерапрыемства арганізоўваецца на самым высокім узроўні з удзелам кіраўнікоў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, членаў урадаў, кіраўнікоў усіх рэгіёнаў, міністэрстваў і ведамстваў дзвюх краін».

Ключавой тэмай форуму вызначана прамысловая палітыка Саюзнай дзяржавы. «Цяпер, нягледзячы на наладжанае добрае ўзаемадзеянне, у дачыненні прамысловых комплексаў дзвюх краін застаецца маса нявыкарыстаных магчымасцяў, — лічыць віцэ-мэр Мінска і дадае: — Узаемавыгаднае супрацоўніцтва рэгіёнаў — неад'емны элемент эканамічнай інтэграцыі дзвюх краін».

Дарэчы, у рамках праграмы форуму беларуская сталіца заяўлена ў адной з секцый з выступленнем на тэму «Шляхі рэалізацыі асноўных прынцыпаў і задач рэгіянальнай прамысловай палітыкі дзяржавы. Паўнамоцтвы органаў улады суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і органаў самакіравання ў сферы прамысловай палітыкі: праблемы і паспяховы досвед». «Работа ў гэтай секцыі дазволіць нам вызначыць адзіныя і ўзгодненыя падыходы да прамысловай палітыкі мясцовых органаў улады нашых краін», — тлумачыць Жанна Бірыч.

Па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама, урадам і Саветам Рэспублікі ўжо распрацаваны і ўзгоднены канцэпцыя і праграма форуму, якая прадугледжвае правядзенне выставы прамысловай прадукцыі нашай краіны, кірмашу-продажу беларускіх тавараў, а таксама падпісанне шэрагу камерцыйных кантрактаў і пагадненняў з рэгіёнамі Расіі.

«Сярод больш чым 80-ці прадпрыемстваў, якія прымаюць удзел у прамысловай выставе ў мэтах прэзентацыі перадавых беларускіх распрацовак у галіне навукі і тэхналогій, ваеннага, нафтахімічнага і дрэваапрацоўчага комплексаў, а таксама ў экспазіцыі тавараў народнага спажывання, звыш 20-ці — сталічныя», — паведамляе Жанна Эдуардаўна. Гэта «Белкамунмаш», МАЗ, «Амкадор», Мінскі трактарны завод, «Гарызонт», «Інтэграл», «Атлант», «Белмедпрэпараты», «Мінскінтэркапс» ды інш.

«Напярэдадні форуму мінскімі прадпрыемствамі ўжо заключана больш за 155 кантрактаў з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі на агульную суму звыш 7 мільярдаў расійскіх рублёў», — дзеліцца звесткамі віцэ-мэр Мінска. Што тычыцца трэцяй часткі форуму — кірмашу-продажу, — то на ім жыхарам і гасцям горада Сочы прапануюць шырокі спектр спажывецкіх тавараў беларускай вытворчасці. Мінск на кірмашы прадставіць асноўныя брэнды — «Мінскхлебпрам», «Камунарка», Кандытарская фабрыка «Слодыч», «Крыніца», «Беліта», сувенірная прадукцыя «Белмастацпромыслы». Па словах Жанны Бірыч, караван з беларускімі малочнымі, мяснымі, кандытарскімі вырабамі, а таксама трыкатажам і абуткам адправіцца ў сонечны горад ужо 13 верасня.

Вераніка ПУСТАВІТ, *pustavit@zviazda.by*

■

■ Май на ўвазе!

ПАЖАРНАЯ НЕБЯСПЕКА Ў ЛЯСАХ ЗАХОЎВАЕЦЦА

Сярэдні паказчык пажарнай небяспекі па краіне дасягае чацвёртага — высокага — класа, паведамляе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі са спасылкай на звесткі Гідрамета.

Пры гэтым на большай частцы Брэсцкай, Гродзенскай абласцей, а таксама ў Пухавіцкім, Слуцкім, Барысаўскім, Горацкім, Клічаўскім, Жлобінскім, Акцябрскім і Віцебскім раёнах пажарная небяспека лясоў ужо дасягае пятага класа. Па прагнозах Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, у наступныя двое сутак паказчык пажарнай небяспекі чакаецца: 26 жніўня — пераважна трэцяга, чацвёртага класа, месцамі па паўночным захадзе краіны — першага-другога; 27 жніўня — другога, трэцяга класа, месцамі — чацвёртага-пятага класа.

■ Азбука бяспекі

УСІМ КІРОЎЦАМ УКЛЮЧЫЦЬ СВЯТЛО ФАР!

З 25 жніўня па 5 верасня ў светлы час сутак кіроўцы павінны рухацца з уключаным бліжкм святлом фар. Будзе праходзіць спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!».

— З пачатку года ў Мінску з удзелам дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў зарэгістравана 32 дарожна-транспартныя здарэнні, што на шэсць менш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Знізілася і колькасць параненых дзяцей. 65,6 працэнта ад агульнай колькасці пацярпелых пры ДТЗ дзяцей склалі пешаходы, 18,7 працэнта — пасажыры, 15,6 працэнта — дзеці-веласіпедысты. Падчас спецыяльнага комплекснага мерапрыемства інспектары ўзмоцняць кантроль за захаваннем Правіл дарожнага руху паблізу школ і дзіцячых садкоў, — паведаміла **кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна ХАРЛІНСКАЯ.**

Спецыяльна да новага навучальнага года айчынныя праграмісты пры падтрымцы ДАІ Мінска і Беларускага клуба аўтамотатурызму распрацавалі мабільны дадатак StartRoad для інфарміравання юных удзельнікаў дарожнага руху аб правілах паводзін.

Сяргей РАСОЛЬКА, *rs@zviazda.by*

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Жарский сельский исполнительный комитет Ушачского района Витебской области проводит открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома гражданам, расположенного на территории сельсовета

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Городец, 224982402601000058	0,2439	Сети электроснабжения	13 683 034 Кроме расходов на организацию и проведение аукциона	20 000 000	2 000 000

Задаток перечисляется на р/с 3641328040935 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк код 150801648, УНП 300007203, ОКПО 28677767, код платежа 04901 Жарский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в положении о его проведении.

Аукцион состоится **25.09.2015 г.** Начало **в 10.00** по адресу: **д. Жары, ул. Центральная, 18 (здание исполкома) Ушачского района Витебской области.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 22.09.2015 года до 17.00** по вышеуказанному адресу. Телефоны: **(8 0158) 2 36 42, 2 36 43.**

РУП «Белпочта»

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Аварийный ремонт участка теплотрассы, расположенного на дворовой территории здания специализированного связи по ул. Вокзальная, 22 в г. Минске».

Процедура переговоров состоится «01» сентября 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

Контакты для получения дополнительной информации:
отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29, 293-55-28.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 07 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом №5а от 22.01.2014 г.

№ лота	Наименование предмета торгов, местонахождение имущества, условия оплаты	Краткая характеристика предмета торгов	Начальная цена, белорусских рублей (с НДС)	Задаток, белорусских рублей
1	**Технологическое оборудование для изготовления конструкций из ПВХ** в количестве 14 единиц **Местонахождение имущества:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Владимирова, 10 **Условия оплаты:** по соглашению сторон	Перечень оборудования: 1. станок для обработки торцов импоста мод. KM212; 2. станок прямолинейной обработки кромки стекла мод. SE10M; 3. станок для фрезерования водоотливных канавок мод. ST263; 4. станок экономичный углозачистной мод. CA601 (инв.№ 700185); 5. копировально-фрезерный станок мод. FR224; 6. машина горячего прессования для стеклопакетов мод. RP-1500; 7. машина мойки и сушки стекла мод. TRW-1500; 8. одноголовочная ПВХ-сварочная машина мод. TK501; 9. пила для резки штапика; 10. пила с изменяемым углом резки 350 мм мод. KD350 (пневм.); 11. стенд для нанесения герм. ленты мод. TRT-1300; 12. установка для заполнения газом мод. TRG-2; 13. установка компрессорная мод. СБ4/Ф-270LB75; 14. экструдер бутила (хот-мелта)	712 920 000	25 000 000

Первоначальное объявление о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 27 декабря 2014 г.

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельский завод «Коммунальник», 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 10.

Организатор торгов: Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «ГомельИнвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел.: (0232) 25 49 00, факс (0232) 25 49 01.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе 07 сентября 2015 г.».

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, (резиденты и нерезиденты Республики Беларусь), подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и подавшие своевременно необходимые документы.

Документы для участия принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по 04.09.2015 г. включительно.

Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подавшие в установленный срок заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию **с 10.00 до 11.00 07 сентября 2015 г.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:

- подписать протокол о результатах аукциона.

- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов возместить Организатору вознаграждение, включая фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. Размер вознаграждения составляет 4% от начальной цены проданного с аукциона объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;

- в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов;

- в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона (единственным участником, не пожелавшим купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%), возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Задаток участника аукциона, ставшим Победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), засчитывается в счет окончательной стоимости предмета торгов.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет пятьдесят базовых величин за каждый случай нарушения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Справки по тел. (029) 679 02 81.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 жніўня 2015 г. № 16 (356)

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

АДРЭАГАВАЦЬ З ПАМЕТКАЙ «ТЭРМІНОВА»

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Прамыя тэлефонныя лініі з жыхарамі, на думку старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандра АЦЯСАВА, — эфектыўная практыка зносін улады і людзей. У апошні час, як ён заўважыў, людзі менш скардзяцца. Яны больш прапануюць: як уладкаваць жыццё ў горадзе, пасёлку. Але ёсць і звароты, на якія трэба рэагаваць аператыўна. Менавіта такі «сігнал» па тэлефоне кіраўнік прадстаўнічай улады Прыдзвінскага краю атрымаў у мінулую суботу.

Дэкрэтніца, якая жыве ў віцебскім інтэрнаце на беразе Заходняй Дзвіны, эмацыянальна распавяла пра... начную дыскатэку ў гістарычным цэнтры, што элементарна перашкаджае спаць.

— Мы жывём у інтэрнаце. А праз раку — кавярня (насупраць найстарэйшага храма XII стагоддзя і плошчы Тысячагоддзя Віцебска. — **Аўт.**). Там у ноч з пятніцы на суботу і з суботы на нядзелю на вуліцы арганізуюць дыскатэкі. З адкрытай веранды далёка чуваць гучная музыка. І так да чатырох, паловы пятай раніцы. Праз гэта, зразумела, немагчыма заснуць. Праблема не толькі мяне хвалюе, але, паверце, усіх жыльцоў нашага інтэрната і суседняга, — паведаміла гараджанка.

Суседзі заяўніцы — работнікі пошты і сувязісты. Як пасля бяссоннай ночы ісці на працу? Яны спадзяюцца, што ўлада дапаможа. Так, у кавярні маюць права забаўляць людзей. Але ж з прычыны гэтага не павінны цярпець іншыя. Маладая мама падчас размовы з Аляксандрам Ацясавым у якасці доказу гатова была нават даць паслухаць запіс той музыкі. Ён зроблены ў пакоі, але здаецца, быццам бы зусім побач... Аляксандр Ягоравіч выказаў шчырую салідарнасць. Каму такое чужое свята спадабаецца, калі ноччу хочацца цішыні? Даручыў памочніку зварот з паметкай «тэрмінова» накіраваць на рэагаванне. У міліцыі, упраўленні гандлю абавязаны разабрацца не адкладваючы...

Нечаканай стала просьба ад жыхаркі гарадскога пасёлка Коханава Талачынскага раёна.

— Не можам з мужам месяц прымусіць суседа прыбраць 5 тон (!) гною, які ляжыць прыкладна ў 10 метрах ад нашага дома. Сусед, як кажуць, «далёка пасылае». Мясцовая ўлада дапамагчы не спяшаецца, — паведаміла жанчына. Зразумець яе можна: дрэнны пах, мухі, антысанітарыя... Старшыня аблсавета паабяцаў патэлефанаваць адказным асобам. Вінаватага трэба аштрафаваць і прымусіць навесці парадак.

А жыхарка гарпасёлка Баравуха, які недалёка ад Наваполацка, з крыўдай паведаміла, што ў яе хочуць адабраць зямельны ўчастак. Маўляў, чыноўнікі канкрэтызавалі: не пабудуеце дом за месяц, зямлі ў вас не будзе! Падчас размовы высветлілася, што яшчэ ў 2000 годзе сям'і было дадзена права будаўніцтва. Людзі мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Дык чаму ж не будаваліся 15 гадоў? Заяўніца растлумачыла, што падманула фірма-забудоўшчык. Сітуацыя зразумелая. Але ж можна было за столькі гадоў патроху ўзводзіць сцены. Існуе ж адпаведнае заканадаўства, якое накіравана на тое, каб зямля не пуставала. Даручана разабрацца ў сітуацыі.

З таго ж населенага пункта патэлефанавала грамадзянка, якую «гняце»... двухметровая жалезабетонная агароджа суседняга дома.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Валянціна ЕЎДАКІМАВА з Евай ШАГАВАЙ робяць адну справу.

ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА

ТОЙ САМЫ ДВОРЫК

Нэлі ЗІГУЛЯ

Ёсць у Магілёве месцы, куды работнікі камунальных службаў найчасцей водзяць афіцыйных гасцей горада і мясцовыя ўлады. Паглядзець там сапраўды ёсць што. Сцены пад'ездаў нагадваюць творы анімацыйнага мастацтва, як і кветнікі, і дэкаратыўныя кампазіцыі. І ніякая гэта не паказуха. Проста ў горадзе ёсць жыхары, якія прывыклі адчуваць сябе не староннімі наглядальнікамі, а творцамі. Вядома, не абыходзіцца тут і без натхняльнікаў. Валянціна Еўдакімава — адна з іх.

Не кожны можа быць дворнікам...

У сістэме ЖКГ яна працуе з 1977 года. Прычым увесь гэты час выключна ў ЖЭУ №4. Апошнія 10 гадоў яна начальнік участка і па сумяшчальніцтве старшыня савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны № 7, у якую ўваходзяць 29 дваровых тэрыторый. Непасрэдная ўдзельніца і каардынатар дзейнняў па падтрымцы належнага санітарнага стану, правядзенні добраўпарадкавання і навядзенні чысціні.

— У нас створана 5 дамавых камітэтаў, — расказвае Валянціна Кузьмінічна. — Адзін з іх па вуліцы Гагарына прызнаны найлепшым у горадзе. Не горш працуе дамавы камітэт па бульвары Непакораных. Запрашаем жыхароў на суботнікі, дапамагаем рабіць у пад'ездах рамонты. Ёсць жыльцы, якія перажываюць за тое, каб іх дом быў узорны. Найчасцей гэта людзі больш сталага ўзросту, але хапае і моладзі. Імкнёмся, каб у пад'ездах былі парадак і чысціня, каб не курылі, каб актыўней са старшымі па пад'ездзе кантактавалі.

Валянціна Еўдакімава лічыць сваю прафесію найлепшай і самай неабходнай. І савет тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — добры спосаб сумеснымі намаганнямі дамагчыся станоўчых вынікаў. У яго склад уваходзяць людзі, зацікаўленыя ў навядзенні парадку, а рабіць сваю справу з удзелам аднадумцаў значна лягчэй.

ЖЭУ №4 абслугоўвае 85 жылых дамоў па вуліцах Астроўскага, Гагарына, бульвары Непакораных, праспектах Пушкінскім і Шміта. У штаце 94 чалавекі, з іх 69 дворнікаў. Але нават калі б іх было ў 2 разы больш, навесці парадак без удзелу жыхароў было б няпроста. На думку Валянціны Еўдакімавай, самыя актыўныя жыхары жывуць на бульвары Непакораных і вуліцы Гагарына. Там двары патанаюць у кветках...

— У нас 20% дваровых тэрыторый адрамантавана капітальна, шырэйшая стала праезная частка, на дарожках з'явілася плітка. І няпраўда, што людзі менш часу сталі праводзіць у дварах.

У ЖЭУ працуюць сапраўдныя майстры. З падручных матэрыялаў (на участку падчас апошняга ўрагану вецер паваліў 64 (!) дрэвы) робяць розных казачных герояў. Паравозік з Рамашкава, жар-птушку, розных чарапашак і лебедзяў. З ПЭТ-бутэльек атрымліваюцца цудоўныя пальмы, званочкі, ландышы. «Сёння мы яшчэ не кожнага дворніка на працу возьмем, — сцвярджае Валянціна Кузьмінічна. — Трэба, каб чалавек быў старанны, а не проста час адбываў. Прыклад для пераймання — Людміла Бялова, якая прыбірае двор па праспекце Шміта. У яе такая чысціня заўсёды, што не ў кожнага дома так бывае. Нам часта тэлефануюць, каб падзякаваць ёй».

Пад'езд ці... мастацкая галерэя?

Разам з Валянцінай Еўдакімавай і намеснікам дырэктара ЖРЭУ Кастрычніцкага раёна Таццянай Касаткінай рушым на агляд мікразоны. Жыхары пяціпавярховіка па бульвары Непакораных, 7 летась выканалі рамонт пад'езда за ўласны кошт. Ён сапраўды ўражвае дагледжанасцю. Усюды дэкаратыўныя кветкі, на сценах з першага па пяты паверх — карціны.

— Тут жыльцы на рэдкасць актыўныя, — тлумачыць начальнік ЖЭУ. — Адны з першых у Магілёве ўсталявалі прыборы ўліку цяпла, а на дзвярах — дамафоны. За апошнія 15 гадоў пад'езд двойчы рамантаваўся з удзелам жыхароў. Раней, напрыклад, было проста пафарбавана, а цяпер з'явіліся яшчэ і элементы аздаблення. На апошні капрамонт яны патрацілі каля 2,5 мільёна — па 150 тысяч з кватэры. Гэты пад'езд быў адзначаны падзячным лістом абласнога Савета дэпутатаў. А на грашовую прэмію жыхары збіраюцца купіць лінолеум.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У доме па вуліцы Яраслаўскай малюнкі на кожным кроку

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ПРА «МОЖНА» І «НЕЛЬГА»

З якімі праблемамі прыходзяць да дэпутата Палаты прадстаўнікоў жыхары сталіцы?

Надзея ЮШКЕВІЧ

У сталіцы — горадзе з двухмільённым насельніцтвам — дэпутам быць няпроста. Як нідзе, тут востра стаіць жыллёвае пытанне, цягнуцца бясконца праблемы з забудовай... Ды і людзей, хоць горад і падзелены на выбарчыя акругі, таксама шмат — нехта прыходзіць з праблемай, хтосьці — проста пагаварыць... Дэпутат ад Кальварыйскай выбарчай акругі №104 Міхаіл САВАНОВІЧ, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, расказаў, з чым прыходзяць да яго мінчане і ў якіх пытаннях дапамагчы атрымліваецца не заўсёды.

Прыватны сектар — праблемны сектар

Яшчэ не так даўно Міхаіл Фёдаравіч быў старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Таму ён можа параўноўваць.

— Сёння нашмат больш складана вырашаць тыя пытанні, з якімі звяртаюцца людзі. На ўзроўні гарадскога Савета дэпутатаў зрабіць гэта было прасцей. Гарадскі Савет і гарадскі выканаўчы камітэт працуюць разам. Да мяне звярнуўся чалавек з нейкай праблемай — я пайшоў адразу да намесніка старшыні выканкама, і мы разам падумалі, чым можна дапамагчы ў сітуацыі. Цяпер усё трошкі па-іншаму.

Акруга Міхаіла Савановіча складаецца з дзвюх частак — гэта частка Фрунзенскага раёна і частка Цэнтральнага.

> Сёння ўжо выразна акрэслена: бізнес-цэнтр ля «Юбілейнага» будавацца не будзе. Гарвыканкам адмяніў сваё рашэнне па выдзяленні зямельнага ўчастка. Праўда, фірма судзіцца, але, думаю, суд яе не падтрымае

— Адпаведна, праводжу прыёмы і ў Фрунзенскім раёне, і ў Цэнтральным, — расказвае ён. — У «маёй» частцы Цэнтральнага раёна жыллё амаль новае — гэта ад вуліцы Мельнікайтэ і да прадпрыемства «Атлант». Грамадзян адтуль прыходзіць няшмат. Большасць, як правіла, з Фрунзенскага раёна. На маім участку — ад ГЦ «Карона» да праспекта Пушкіна — шмат старога жылля, якому па 40-50 гадоў.

Як заўважае парламентарый, у «яго» частцы Фрунзенскага раёна — вялікі прыватны сектар, які мае шмат праблем.

— Вось, напрыклад, чалавек жыве ў прыватным доме, які абяцаюць знесці ўжо... 30 гадоў. Ён не мае права яго рэканструяваць, бо дом «пад знос». Але ж невядома, калі яго знясуць. Мясцовыя ўлады кажуць, што гэта адбудзецца, «калі прыйдзе інвестар». А калі ён прыйдзе? І тут таксама асабліва не дапаможаш — пры ўсім жаданні. На жаль, да майго прыходу ў Палату прадстаўнікоў Жыллёвы кодэкс ужо быў прыняты, і, натуральна, пакуль нічога новага туды не ўнясеш. Падказваеш нешта чалавеку, бо, напрыклад, сёння можна ў такія дамы праводзіць газ, ваду, каналізацыю. Усё гэта, у прынцыпе, магчыма. Праўда, рамонт можна рабіць толькі ў межах дома. Калі ж гаспадар хоча зрабіць нейкую прыбудову, то, на жаль, не мае на гэта права.

Апошняя інстанцыя

— Калі чалавек прыходзіць з рэальнай праблемай, але ў той жа час я ведаю, што па сённяшніх заканадаўчых нормах задаволіць яго просьбу немагчыма, то тлумачу яму гэта. Уявіце сабе сітуацыю: стаяць побач два дамы амаль аднолькавага года пабудовы — прыкладна 40 гадоў іх узрост. У адным доме гадоў пяць таму зрабілі капітальны рамонт. Яго ўцяплілі, памянялі вокны. Потым змяніліся нарматывы: сёння ўцяпленне робіцца за кошт грамадзян, вокны — таксама. Таму ў суседнім доме толькі «стаякі» памянялі — і ўсё, капітальны рамонт скончаны. Як гэта людзям патлумачыць? Бо і з аднаго дома жыхары 40 гадоў плацілі за капітальны рамонт, і з другога... Мясцовыя ўлады ў парадку выключэння могуць прыняць рашэнне і нешта дадаткова зрабіць.

Калі людзі — супраць

— Балючым пытаннем з'яўляецца ўшчыльненне забудовы, — канстатуе Міхаіл Савановіч. — Жыхары раёна магазіна «Юбілейны», што на вуліцы Заслаўскай, звярнуліся да мяне па дапамогу менавіта з гэтай прычыны.

Аказалася, на тэрыторыі сквера ля магазіна некаму прыйшла ў галаву ідэя пабудаваць бізнес-цэнтр з банкам.

— Натуральна, людзі выступілі супраць будаўніцтва і паднялі гэтае пытанне яшчэ ў 2012 годзе. Тады гарвыканкам выслаў адказ, што, маўляў, будаўніцтва не будзе. Але праходзіць некалькі месяцаў, і пытанне пра бізнес-цэнтр на месцы сквера выносіцца зноў. Людзі зноў выступаюць супраць, я зноў звяртаюся ў гарвыканкам, мне зноў абяцаюць, што ніякага будаўніцтва не будзе. А праз некаторы час даведваемся, што гарвыканкам заключае інвестыцыйны дагавор на будаўніцтва бізнес-цэнтра. Усё пайшло па новым крузе... У выніку сёння ўжо выразна акрэслена: бізнес-цэнтр ля «Юбілейнага» будавацца не будзе. Гарвыканкам адмяніў сваё рашэнне па выдзяленні зямельнага ўчастка. Праўда, фірма судзіцца, але, думаю, суд яе не падтрымае, бо людзі катэгарычна супраць. Гэта, я лічу, той прыклад, дзе і людзі мелі рацыю, і мой удзел адыграў не апошнюю ролю.

> Многія грамадзяне лічаць, што паколькі ты — прадстаўнік заканадаўчай улады, то і з законамі «на кароткай назе».

Або яшчэ адзін выпадак вырашэння набалелай праблемы.

— Ля дома ў прамысловым раёне паставілі пункт збору другаснай сыравіны. Атрымліваецца, ля дома і макулатуру збіраюць, і метал туды прывозяць, які грыміць падчас выгрузкі. Таксама давялося звярнуцца да ўлады на ўзроўні раёна, і сёння гэты пункт закрылі. Побач — прамысловая зона, і было б лагічна паставіць яго там адразу, не нерваваць людзей.

Дэпутат, акрамя індывідуальных прыёмаў грамадзян, праводзіць сустрэчы з працоўнымі калектывамі, дзе людзі таксама дзеляцца тым, што іх трывожыць.

— Неяк на спецкамбінаце бытавога абслугоўвання супрацоўнікі паднялі пытанне: у сталіцы можа так здарыцца, што не будзе дзе хаваць людзей. Амаль усе могілкі ўжо запоўнены, засталіся толькі адны — Заходнія, але і там хутка скончацца месцы. Давялося падняць гэтае пытанне падчас нарады ў гарвыканкаме, і ў выніку месца знайшлося.

Знайдзіце працу для ўнука

Многія скардзяцца, што працу зараз знайсці не так проста, асабліва пасля ўступлення ў сілу адпаведнага дэкрэта Прэзідэнта. Аднак да дэпутата з такой просьбай звяртаюцца нячаста.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДЭМАГРАФІЯ Ў РАЗРЭЗЕ

АДКУЛЬ «МІНУС»?

Падчас сесіі дэпутаты раённага Савета шукалі прычыны памяншэння колькасці насельніцтва

Святлана ЯСКЕВІЧ

У 2014 годзе ў Бярозаўскага раёна былі ўсе падставы атрымаць, нарэшце, дэмаграфічны плюс, але зноў выйшаў мінус — аж на 17 чалавек. Не, немаўлят тут нарадзілася больш, чым сышло людзей, якія памерлі сваёй смерцю. Але ж 69 чалавек раён страціў з так званых знешніх прычын: іншымі словамі, суайчыннікі гінулі на дарогах, на пажарах, на вадзе... На сесіі раённага Савета дэпутаты абмяркоўвалі гэтую праблему і спрабавалі знайсці нейкія падыходы да яе вырашэння. Журналіст «МС» папрасіла асобных удзельнікаў сесіі выказаць свае думкі наконт узнятага пытання.

Мікалай ЧЫЖ, старшыня Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Дэмаграфічная праблема — адно з галоўных у блоку сацыяльных пытанняў развіцця краіны. Мы цудоўна разумеем, што яе нельга вырашыць у асобна ўзятым раёне. Але намеціць некаторыя шляхі, зрабіць канкрэтныя крокі ў зададзеных кірунках мы можам. Што і паспрабавалі зрабіць дэпутаты пасля ўсебаковага аналізу сітуацыі.

Здавалася б, столькі карысных, цікавых, змястоўных мерапрыемстваў у падтрымку інстытута сям'і, здаровага ладу жыцця праводзіцца з сем'ямі, моладдзю, а на светапогляд людзей гэта ўплывае занадта павольна. Нашы спецыялісты пералічылі назвы разнастайных акцый, мерапрыемстваў па зададзенай тэме — атрымаўся вельмі ўнушальны спіс. Ходзім у калектывы, чытаем лекцыі, праводзім гутаркі, заклікаем, агітуем, пераконваем, а праблемы ці не перастаюць існаваць, ці «вылазяць» з іншага боку. Калі недзе ўдалося адвярнуць падлеткаў ад прывычкі да п'янства, то трывогу выклікаў рост спажывання маладымі людзьмі наркотыкаў. Асабліва гэтая бяда характэрна для Беларазёрска. І не сказаць, каб спалі ў шапку супрацоўнікі адпаведных службаў гэтага горада, але выкараніць зло не ўдаецца. Значыць, недастаткова працуем, каб дастукацца да кожнага, каб падтрымаць сем'і, адгарадзіць дзяцей ад негатыўных прыкладаў. Трэба шукаць больш дзейсныя формы работы.

Маргарыта ТАЛКУН, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бярозаўскага райвыканкама:

— Нараджальнасць у раёне паступова расце. Напрыклад: калі ў 2011 годзе каэфіцыент нараджальнасці складаў 11,9, то ў 2014-м ён падняўся да 13,0 (на 1000 насельніцтва). Гэтаму, несумненна, паспрыялі меры падтрымкі, прынятыя дзяржавай. І вось ужо дзве мамы падалі дакументы на атрыманне сямейнага капіталу. За апошнія чатыры гады дзевяць жанчын у раёне былі ўзнагароджаны ордэнам Маці. Маламаёмасным сем'ям аказваецца адрасная дапамога, такая, напрыклад, як забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей да двух гадоў, бацькі атрымліваюць дапамогу на падрыхтоўку да школы. Прыемна адзначыць, што намецілася тэндэнцыя да паніжэння колькасці разводаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але ж асаблівую трывогу выклікае іншая статыстыка. Даводзіцца канстатаваць рост загінулых у ДТЗ. Пры гэтым супрацоўнікі дарожнай міліцыі адзначаюць, што аварыі нярэдка здараюцца як па віне п'яных вадзіцеляў, так і па віне нецвярозых пешаходаў. У абодвух выпадках гінуць людзі.

Яшчэ некалькі лічбаў: за апошнюю пяцігодку ад пажараў на тэрыторыі раёна загінула 24 чалавекі. 16 з іх — грамадзяне працаздольнага ўзросту, праўда, не ўсе працавалі. Для некаторых гібель стала фактычна вынікам асацыяльнага ладу жыцця. Апошнія злоўжывалі алкаголем. Церпяць, а то і гінуць ад пажараў і старыя адзінокія людзі. І хоць кожны год з бюджэту раёна выдаткоўваюцца сродкі на рамонт печаў, электраправодкі, усталяванне аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, пакуль, як бачым, праблема застаецца. Мясцовым органам улады трэба больш надаваць ёй увагі.

Вячаслаў САКОВІЧ, намеснік галоўнага ўрача Бярозаўскай раённай бальніцы:

— Гібель людзей ад знешніх фактараў застаецца актуальнай праблемай. Ужо шмат гадоў знешнія прычыны займаюць трэцяе месца ў структуры смяротнасці жыхароў раёна. З 69 чалавек, якія загінулі летась, 49 былі ў працаздольным узросце. 90% з іх — мужчыны (вось вам і прычыны розніцы ў працягласці жыцця). Ёсць у гэтай сумнай статыстыцы і выпадковыя атручэнні алкаголем. Непакоіць і даволі высокая колькасць самагубстваў. З 13 чалавек, якія добраахвотна пайшлі з жыцця летась, толькі двое пакутавалі на псіхічныя хваробы. Восем чалавек у мінулым годзе загінулі на вадзе, у іх ліку — адно дзіця.

І зноў жа, калі прааналізаваць прычыны траўмаў, якія атрымалі жыхары раёна за год, то амаль у палове выпадкаў прысутнічае алкаголь. Як ні круці, выходзім на сацыяльную праблему, якую трэба вырашаць. Здароўе ж — катэгорыя не медыцынская, а найперш сацыяльна-эканамічная. Колькі затрат вымушана несці грамадства на лячэнне толькі тых людзей, якія атрымалі цялесныя пашкоджанні, траўмы, калецтва ў выніку знешніх прычын!

З года ў год расце колькасць матэрыялаў па медыцынскай тэматыцы ў мясцовых сродках масавай інфармацыі. Прафілактычная работа, здаецца, вядзецца па ўсіх кірунках, але выніковасць яе, якая мае на ўвазе фарміраванне адказнасці кожнага за сваё здароўе і здароўе сваіх блізкіх, застаецца невысокай. Значыць, робім не тое і не так, не знаходзім правільныя шляхі, каб дастукацца да людзей?

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПРА «МОЖНА» І «НЕЛЬГА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Наконт працаўладкавання да мяне звярталася толькі... бабуля. Яна прасіла, каб я дапамог працаўладкаваць яе ўнука. Але там сітуацыя такая: унук не хоча працаваць. Тры гады таму скончыў школу, вучыцца нікуды не пайшоў, цэлымі днямі сядзіць дома і гуляе ў камп'ютарныя гульні. Як я магу дапамагчы ў гэтым выпадку? Прапанаваў, што называецца, стварыць яму «ўмовы». Хлопец гэты жыве з маці, а бабуля з дзедам — асобна. Натуральна, маці гатуе яму есці, бабуля з дзедам даюць грошы на адзенне. Па-першае, не давайце грошай. Па-другое, пакіньце яго аднаго: няхай маці пакуль пажыве ў вас, а ён, магчыма, падумае, як пражыць, калі табе ежа не прыгатавана і ўсё трэба рабіць самому.

А вось працоўныя месцы для нядбайных бацькоў шукаць даводзіцца.

— У мяне ёсць нагрузка, можа, не зусім дэпутацкая, хутчэй, грамадская, — прызнаецца мой суразмоўца. — Я, напрыклад, узначальваю савет апорнага пункта аховы правапарадку аднаго з мікрараёнаў маёй акругі. У склад савета ўваходзяць дырэктары школ, кіраўнікі або намеснікі кіраўнікоў прадпрыемстваў, дырэктар ЖЭС, інспектар па справах непаўналетніх. Гэты савет у тым ліку разглядае пытанні выканання дысцыпліны абавязанымі асобамі — бацькамі тых дзяцей, што ўтрымліваюцца ў дзіцячых дамах. Як правіла, такія бацькі спіліся. Часта трэба шукаць, куды іх можна працаўладкаваць. Там вельмі шмат складаных пытанняў. Аднак вельмі прыемна, калі чалавек пасля гутаркі абяцае больш не піць, і трымае сваё слова.

Прычым тут дэпутат?

Аднак не ўсе просьбы, з якімі звяртаюцца да дэпутата, могуць быць задаволены.

— Яшчэ адзін нюанс, з якім я сутыкаўся, з'яўляючыся дэпутатам ужо Палаты прадстаўнікоў, заключаецца ў тым, што многія грамадзяне лічаць: паколькі ты — прадстаўнік заканадаўчай улады, дык і з законамі «на кароткай назе». Можаш, напрыклад, адмяніць няправільнае, па іх меркаванні, рашэнне суда. Вельмі шмат прыходзіць людзей з такімі пытаннямі. Адзін пенсіянер скардзіўся на тое, што калісьці, у 1980 годзе, яго незаконна звольнілі з працы, ён з прычыны гэтага ўжо неаднаразова судзіўся. За такія справы не бяруся і адразу кажу пра гэта чалавеку. Не мая кампетэнцыя. Або яшчэ прыклад — не могуць з суседам падзяліць 20 сантыметраў зямлі на дачы ў Дзяржынскім раёне. Таксама ўжо ёсць рашэнне суда. Прычым тут дэпутат? Такія пытанні я, натуральна, не вырашаю.

yushkevich@zviazda.by

А горку і арэлі купілі за свае грошы.

ТОЙ САМЫ ДВОРЫК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Не менш прыгожа ў суседнім пад'ездзе. Старшая па ім Ева Сямёнаўна Шагава — сапраўдны прыклад для астатніх. Яна не чакае, пакуль нехта штосьці зробіць — клумбу пасадзіла сама і даглядае яе. Запэўнівае, што ёй гэта падабаецца. Дачы ў жанчыны няма, а тут ёсць магчымасць у зямлі пакорпацца. Зараз іншыя прыклад бяруць, Ева Шагава гэтаму радуецца. На сваім паверсе яна таксама паставіла кветкі, павесіла фіранкі, паслала лінолеум. Суседзі паверхам вышэй паглядзелі і зрабілі тое ж.

На гэта грошай не шкадуем

— У нас ёсць унікальны дом, ад якога ўсе ў захапленні, — запрашае на тэрыторыю ЖЭУ №8 Таццяна Касаткіна. — Каля 70% яго жыхароў — выключна маладыя людзі. Пяць гадоў таму, калі спраўлялі наваселле, паабяцалі зрабіць з дома сапраўдную цукерку. І зрабілі яе. На першы погляд, звычайная «панэлька», але ад таго, што ўнутры, нельга не прыйсці ў захапленне.

Калі заходзіш у пад'езд дома №15а па вуліцы Яраслаўскай, нібы трапляеш у казку. Прыгожа — вачэй не адвесці. Фарбы купілі жыхары, а вось творчасцю займалася мастачка з ЖЭУ. На першым паверсе знаходзіцца спецыяльны куток для наглядной агітацыі: трэба, каб кожны ведаў свае правы і абавязкі.

— А яшчэ кажуць, што моладзь у нас неактыўная, — здзіўляецца Таццяна Касаткіна. — Калі некалькі гадоў таму зрабілі першы пад'езд — ён у горадзе быў прызнаны найлепшым. Зараз зроблены тры пад'езды. Калі дэпутаты былі тут, жыльцы паабяцалі, што пад'ездамі не абмяжуюцца. У выніку летась занялі 2-е месца сярод дваровых тэрыторый.

Сёлета жыхары купілі горку, арэлі, камунальнікі зрабілі альтанку з закупленых жыхарамі дошак. У планах — футбольная і баскетбольная пляцоўкі.

— Зробім і разметку для аўтамабіляў, — кажа Таццяна Касаткіна. — Кіраўнік адміністрацыі прыязджаў, размаўляў з жыхарамі, яны дзяліліся планамі, казалі, чаго ім не хапае. Ён абяцаў дапамагчы.

Старшая па пад'ездзе Таццяна Міхайлоўская гатова падзяліцца вопытам. Прызнаецца, што дамагчыся такіх вынікаў можна толькі дзякуючы ўпартасці.

— Большасць з нас не жадае жыць у брудзе. Калі нешта трэба набыць для агульных патрэб, вывешваем аб'яву, а потым ідзём па кватэрах збіраць грошы. Усе ставяцца з разуменнем. Прыемна, што мысленне людзей паступова мяняецца. Яны імкнуцца жыць прыгожа.

Фота аўтара

zigulya@zviazda.by

Прыгожа жыць не забароніш (бульвар Непакораных, 7).

жыллё

ПАКУЛЬ ГРОМ НЕ ГРЫМНЕ...

Не разлічваешся за жыллёва-камунальныя паслугі — можаш пазбавіцца кватэры

Атрымаўшы нядаўна «жыроўку», аўтар гэтых радкоў звярнуў увагу не толькі на ўласныя жыллёва-камунальныя плацяжы. На зваротным баку быў надрукаваны спіс грамадзян, якія стаяць у чарзе на высяленне з кватэр па УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна. У ім — 96 наймальнікаў (уласнікаў) жылых памяшканняў з пратэрмінаванай запазычанасцю перад ЖКГ. «Лідар», паводле апошніх звестак, завінаваціўся каля 13 мільёнаў рублёў.

Фота Mixaira ICAHAHKI.

Вымушаны пераезд...

«Заўтра разлічуся...»

Дазваніцца даўжнікам удаецца не заўсёды, бо ў некаторых з прычыны няплаты заблакіраваны дамашні тэлефон, праблема і з мабільнай сувяззю. А калі дазвонішся, то, як правіла, ад неплацельшчыкаў гучаць абяцанкі, што неўзабаве абавязкова разлічацца.

— Яўген Барысавіч, чаму не трымаеце сваё абяцанне пагасіць запазычанасць? — звяртаецца **намеснік начальніка разліково-даведачнага цэнтра №2 УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна Кацярына ДЗЯШКЕВІЧ** да наймальніка адной з кватэр шматпавярхоўкі па вуліцы Дзяржынскага.

За паслугі ЖКГ ён не плаціць ужо тры месяцы, доўг разам з пеняй складае 900 тысяч рублёў. Але той запэўнівае, што на гэтым тыдні разлічыцца. У адваротным выпадку, як папярэджвае Кацярына Яўгенаўна, адключаць святло. Дарэчы, такую меру да яго ўжо прымянялі. Пасля частковай аплаты чалавеку пайшлі насустрач — святло ў кватэру вярнулі. Аднак зноў запазычанасць...

Наступны званок — у арэндную кватэру, за якую не заплачана ўжо каля 13 мільёнаў рублёў. Валерый Часлававіч у няпростай сітуацыі: працаваў індывідуальным прадпрымальнікам, аднак трапіў у бальніцу і зараз работы не мае, развёўся з жонкай. Кажа, што брат павінен выслаць яму грошы на разлік з ЖКХ — будзе прадаваць машыну.

Паводле апошніх звестак РДЦ №2 УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна, пратэрмінаваныя даўгі тычацца 442 рахункаў (каля 3% ад агульнай колькасці), прычым у 87 выпадках запазычанасць больш чым трохмесячная. Увогуле неплацельшчыкі завінаваціліся за паслугі ЖКГ 132,7 мільёна рублёў.

— Пераважную частку гэтых людзей мы ўжо добра ведаем, і яны нашых спецыялістаў — таксама. Тэлефануем неплацельшчыкам, наведваем іх па месцы жыхарства, выклікаем на пасяджэнні камісіі, якія штотыднёва праводзяцца з даўжнікамі ў раённай адміністрацыі, — кажа Кацярына Дзяшкевіч.

Можна застацца без святла і вады...

У рабоце з даўжнікамі ўжо выпрацавалі сістэму. Не паступіла аплата за адзін месяц — званок наймальніку ці ўласніку кватэры, напамін аб доўгу ў рахунку-квітанцыі. Два месяцы не плаціць — атрымлівае папярэджанне аб адключэнні ад камунальных паслуг. Трохмесячная запазычанасць — у суд накіроўваюць іск аб прымусовым спагнанні доўгу з зарплаты, пенсіі. Злосным неплацельшчыкам адключаюць святло і ваду.

— Апошні спосаб барацьбы з неплацельшчыкамі, мяркуючы па нашай практыцы, з'яўляецца асабліва дзейсным. Адключылі ад электра- і водазабеспячэння — нарэшце пачынаюць разлічвацца. Праўда, такія меры цяжка прымяніць, калі ў сям'і непаўналетнія дзеці, на чым нярэдка і спекулююць даўжнікі. Маўляў, як жа нашым дзеткам без святла і вады? — зазначае Кацярына Дзяшкевіч.

Сапраўды, калі ў сям'і, напрыклад, школьнік, то на працягу навучальнага года нельга адключыць гэтую кватэру ад камунальных паслуг. Аднак летам на такі крок у дачыненні да некаторых неплацельшчыкаў ўсё ж вымушаны былі пайсці. І падзейнічала: адразу ж знайшліся сродкі на пагашэнне запазычанасці. Тым больш што зараз сумы камунальных плацяжоў значна меншыя, чым у ацяпляльны перыяд.

Праўда, тэхнічная магчымасць адключыць кватэру даўжніка ад святла ёсць не заўсёды. Калі лічыльнікі знаходзяцца на лесвічнай пляцоўцы, то праблемы не існуе. А калі ў кватэры, то адключыць святло больш складана, бо неплацельшчыкі або дома не знаходзяцца, або дзверы не адчыняюць. Здараецца і так, што ў адной кватэры ў ізаляваных пакоях пражываюць два наймальнікі, у кожнага — свой рахунак па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі. Да аднаго пытанняў няма, а другі — даўжнік. Але як пазбавіць апошняга святла, не парушыўшы правы іншага чалавека?

...І нават без жылплошчы

Увогуле пагроза адключэння святла і вады многіх прымушае плаціць. А тых, каму і гэтая мера «да лямпачкі», чакае іншая, яшчэ больш сур'ёзная, — высяленне з кватэры.

Рашэнне аб высяленні даўжніка (з прадастаўленнем яму іншага жылля меншай плошчы, з горшымі спажывецкімі якасцямі) прымаецца толькі ў судовым парадку. Робіцца гэта не адразу пасля падачы іску. Спачатку з даўжніком праводзяць выхаваўчую работу: спрабуюць пераканаць яго ў неабходнасці плаціць за жыллёва-камунальныя паслугі, даюць час на пагашэнне запазычанасці. У некаторых сітуацыях магчымы нават варыянт рэструктурызацыі доўгу на пэўны перыяд без налічэння пені. Аднак калі ніякія меры выніку не даюць — тады выносіцца судовы вердыкт аб высяленні.

Летась на неплацельшчыкаў, якія знаходзяцца ў сферы адказнасці РДЦ №2 Ленінскага раёна г. Гродна, падалі ў суд 11 іскаў. 5 кватэранаймальнікаў з даўгамі разлічыліся, а 6 — былі выселены. Назаўсёды, без права вярнуцца ў страчаную кватэру. Пры гэтым запазычанасць, што паслужыла прычынай высялення, спісанню не падлягае — яна па-ранейшаму застаецца за даўжніком.

Пасля высялення на іншую жылплошчу даўжнікі паводзяць сябе па-рознаму. Напрыклад, адзін з іх, пераехаўшы з двухпакаёвай кватэры ў аднапакаёўку, нешта ўсё ж усвядоміў — плаціць за новае жыллё і паступова разлічваецца за ранейшае. Аднак бывае і інакш. За няплату іншаму мужчыну адключалі святло, ваду, а потым па рашэнні суда выселілі з двухпакаёўкі ў адзін з пакояў кватэры з агульнай кухняй. У дзень пераезду ён адчыніў дзверы толькі па патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі. А што зараз? На ім не толькі вісіць запазычанасць за ранейшую кватэру (адміністрацыя раёна перадала яе пад камерцыйнае жыллё), але і накопліваюцца даўгі на новым месцы. Сітуацыя тупіковая: якія меры яшчэ можна прымяніць? Наогул выселіць з горада? Але на якую жылплошчу? Такога жылля сёння ў распараджэнні ЖКГ няма.

Дарэчы, ужо з'явіліся злосныя неплацельшчыкі і за арэндныя кватэры. Здавалася б, ведаеш умовы разліку за такое жыллё і павінен рэальна сувымяраць з імі свае фінансавыя магчымасці. Але... У адным з выпадкаў доўг дасягнуў ужо 12 мільёнаў рублёў, жанчыну з непаўналетнімі дзецьмі з гэтай кватэры выселілі. Прычым, калі наймальніку памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду прадастаўляюць іншае (няхай і меншай плошчы, горшае па спажывецкіх якасцях), то ў дачыненні да даўжнікоў за камерцыйнае жыллё гэта не прадугледжана.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

prakopchik@zviazda.by

...З ПАМЕТКАЙ «ТЭРМІНОВА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Выходзім на вуліцу, а там яна. Неэстэтычна! — яе «аргумент». Але ж, калі адпаведныя нарматывы не парушаны, чым улада дапаможа? Бадай, многім не падабаецца тое, што відаць з акна. Але ж гэта не звалка ля жылля. Пытанне густу...

Вылучыўся таксама зварот наконт «парушэння» дзяржаўнай справаздачнасці. Пенсіянер з Расонскага раёна лічыць, што ва ўпраўленні аховы здароўя ўтойваюць сапраўдную колькасць самагубцаў. А прафілактыка гэтай з'явы, на яго погляд, не дае станоўчых вынікаў. Няўжо суразмоўцу гэта нецікава? Некарэктны зварот — без сутнасці. Хоць пытанне праблемнае і зроблена многае для прафілактыкі. Наконт «утойвання» сапраўдных лічбаў — у чым інтарэс нашых медыкаў?

Іншыя грамадзяне прасілі падтрымкі ў паляпшэнні транспартнага абслугоўвання ў глыбінцы, дапамогі ва ўборцы збожжавых на прыватных участках... Агучана была і «вечная праблема» — зямельная. Колькі прыкладаў, калі суседзі не могуць падзяліць сантыметры памежнай зямлі. Такія і скардзяцца адзін на аднаго і судзяцца. І лічаць, што ўлада павінна стаць менавіта на іх бок... Спрэчкі цягнуцца гадамі, дзесяцігоддзямі.

— Падчас аналізу скаргаў і заяў на абласным узроўні ўлады, напрошваецца вывад, што пытанні можна было б вырашыць на месцах. Але думаю, не трэба так рэзка адмяжоўвацца. Бо чалавек такі: яму здаецца, што чым вышэй ён звернецца, тым хутчэй вырашыць сваё пытанне. А калі гутарыш, высвятляецца. што грамадзянін не звяртаўся ў сельсавет, да раённай улады... Увогуле правядзенне прамых тэлефонных ліній — практыка добрая і яе трэба працягваць, — лічыць Аляксандр Ацясаў.

Безумоўна, такая форма работы з людзьмі карысная як для выхароў краіны, так і для ўлады. Прадстаўнікі апошняй маюць магчымасць, як кажуць, за малым бачыць вялікае. Дыялог з грамадзянамі — гэта і своеасаблівы маніторынг актуальных праблем насельніцтва, рэгіёна наогул.

pukshanski@zviazda.by

АДКУЛЬ МІНУС»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Сяргей ВАСІЛЕЎСКІ, галоўны ўрач Белаазёрскай гарадской бальніцы:

— Яшчэ ў мінулым стагоддзі даследчыкі-дэмографы выявілі прамую залежнасць дэмаграфічнай дынамікі ад духоўнага стану грамадства. Дрэнны духоўны стан адбіваецца не столькі на паказчыках узроўню смяротнасці (яе можна часткова паніжаць з дапамогай высокатэхналагічнай медыцыны і развітай сацыяльнай сістэмы), колькі на самім жаданні нараджаць дзяцей. Устаноўка на прыярытэт пачуццёвых, фізічных задавальненняў перад духоўнымі прывяла да таго, што сіла эгаізму аказалася вышэйшай за патрэбу мець дзяцей. І ў выніку дзіця нярэдка ўяўляецца для маці не як непараўнальная каштоўнасць, а як канкурэнт ў валоданні жыццёвымі дарамі. Часам падсвядома, а то і свядома маці прыходзіць да высновы: «Навошта нараджаць канкурэнта?»

Свабода, на жаль, прыводзіць да вызвалення не толькі найлепшага ў чалавеку, але і найгоршага. Дэмаграфічныя даследаванні паказваюць, што больш за дзве трэція прычын дэпапуляцыі звязаны з такімі ўзніклымі ў постсавецкі перыяд сацыяльна-псіхалагічнымі феноменамі, як сацыяльная дэпрэсія, апатыя і агрэсія.

Адсюль цэлы шэраг прычын, якія спрыяюць дэмаграфічнаму ўпадку. Ну, напрыклад, згасанне інтарэсу да процілеглага полу, звязанае з так званай сексуальнай рэвалюцыяй. Індустрыя інтымных забаў, навязлівая сексуальнасць масавай культуры робяць рэальных жанчын не такімі прывабнымі, як «прыгажуні з вокладак», а дабаўце сюды яшчэ і рост фемінізму і сексуальных вычварэнняў. Акрамя таго, у апошні час заходняя маскультура культывуе інфантылізм дарослых: калі 30-40-гадовыя людзі паводзяць сябе так, быццам ім па 18-20 гадоў — імкнуцца «ўзяць ад жыцця ўсё», аддаючы ўзамен мінімум. Усё гэта, на жаль, уплывае на духоўны свет чалавека, які ўступае ў жыццё, на яго маральны складнік.

Многія асацыяльныя з'явы: алкагалізм, наркаманію, сацыяльнае сіроцтва, злачыннасць, суіцыды — мы можам характарызаваць як дэмаграфічныя пагрозы, бо яны ўплываюць на нараджальнасць і смяротнасць, але ж іх карані — у сферы светапогляду. Таму мы не маем права не ўздзейнічаць на гэтую сферу. Лічу, што многія маладыя людзі гатовы прыняць традыцыйныя для нашай культуры каштоўнасці, але яны іх не ведаюць. Іх галовы забіты іншым — тым, што навязвае масавая культура праз СМІ.

Думаю, што мы паступова прыйдзем да распрацоўкі і прыняцця законаў, якія будуць абараняць менавіта мараль чалавека. Але не варта сядзець склаўшы рукі на мясцовым узроўні і сёння. Скажам, грамадскі савет па маральнасці з удзелам прадстаўнікоў традыцыйных для нашай краіны рэлігійных канфесій ужо цяпер можа выпрацаваць нейкія падыходы і крокі для паляпшэння становішча нават у сваім раёне. Трэба вучыць моладзь усяму самаму добраму.

* * *

Нейкаму скептыку можа падацца, што на занадта глабальнае замахнуліся дэпутаты раённага Савета. Ну, што можна зрабіць у асобным раёне: «адключыць» інтэрнэт альбо забараніць не найлепшыя фільмы? Але старшыня раённага Савета Мікалай Чыж лічыць, што паспрыяць прыняццю законаў, якія будуць ахоўваць грамадскую мараль, можа і павінна ініцыятыва менавіта на месцах. На гэты раз дэпутаты прынялі рашэнне рэкамендаваць кіраўнікам працоўных калектываў заахвочваць тых працаўнікоў, якія вядуць здаровы лад жыцця. А адпаведныя аддзелы райвыканкама атрымалі заданне распрацаваць праграму мерапрыемстваў, накіраваных на адраджэнне традыцыйных сямейных каштоўнасцей. Некаторыя прапановы пакуль засталіся на ўзроўні дыскусіі — для іх яшчэ прыйдзе час.

yackevich@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
Продавец: Открытое акционерное общество «Кожевник», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137, (222) 31-42-83.
Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №700/D-113703, площадью 211,6 кв.м, расположенное по адресу Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137/1-1, наименование: изолированное помещение, назначение: производственное помещение; капитальное строение с инв.№700/С-48917, площадью 572 кв.м, расположенное по адресу Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137, наименование: шерстомойный цех, назначение: здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий; МБП, компьютерная техника в количестве 49 наименований (согласно перечня). Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №740100000003001290 (23/40 доли в праве аренды). Начальная цена: 1 059 886 667 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 105 988 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 52 995 000 бел. руб.
Лот №2. Гидравлическая двоильная машина Rizzi SR6/3000 (инв. №119). Начальная цена: 600 160 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 60 016 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 30 008 000 бел. руб.
Лот №3. Молот пневматический МВ-412 (инв. №1319). Начальная цена: 13 333 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 1 330 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 666 500 бел. руб.
Лот №4. Станок токарно-винторезный 163 (инвентарный №847). Начальная цена: 16 270 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 1 627 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 813 500 бел. руб.
Лот №5. Станок токарно-винторезный 1А62 (инвентарный №837). Начальная цена: 5 020 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 502 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 251 000 бел. руб.
Лот №6. Станок поперечно-строгальный (инвентарный №846). Начальная цена: 3 510 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 351 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 175 500 бел. руб.
Лот №7. Станок фрезерный горизонтально-консольный (инвентарный №836). Начальная цена: 18 930 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 1 893 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 946 500 бел. руб.
Лот №8. ЗИЛ 5301 грузовой платформа тентовая, регистрационный знак АА 7135-6, цвет серо-голубой. Начальная цена: 36 000 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 3 600 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 800 000 бел. руб.
Лот №9. MAZ 53366 грузовой платформа, регистрационный знак ТМ9856, цвет серый, 1997 г.в. Начальная цена: 59 100 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 5 910 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 2 955 000 бел. руб.
Лот №10. Погрузчик МТЗ-82 ПО-26, номерной знак 7144, серия ТА-6, 2009 г.в. Начальная цена: 127 053 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 12 705 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 6 352 650 бел. руб.
Лот №11. Прицеп тракторный 2ПТС-4.5, регистрационный знак ТВ-6 2053, 2013 г.в. Начальная цена: 33 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 3 350 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 675 000 бел. руб.
Лот №12. MAZ 6312А5 370-010, регистрационный знак АВ 0443-6, цвет зеленый, 2009 г.в. Начальная цена: 314 310 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 31 431 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 15 715 500 бел. руб.
Лот №13. Погрузчик экскаватор Карпатец, номерной знак 0647, серия МЖ, 1990 г.в. Начальная цена: 32 700 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 3 270 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 635 000 бел. руб.
Лот №14. Грузопассаж-фургон УАЗ-3909, 1997 г.в., цвет белая ночь, номерной знак ТМ5309. Начальная цена: 21 600 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 2 160 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 080 000 бел. руб.
Лот №15. Трактор МТЗ-80 номерной знак 0645, серия МЖ, 1989 г.в. (инв. №1884). Начальная цена: 45 900 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 4 590 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 2 295 000 бел. руб.
Лот №16. Пресс гидромерийный 07591Р4 (инв. №1296). Начальная цена: 70 470 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 7 047 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 523 500 бел. руб.
Лот №17. Прицеп бортовой MAZ 892600-(017-02), регистрационный знак А 2733 А-6, цвет серый, 2010 г.в. Начальная цена: 39 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 3 950 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 975 000 бел. руб.
Лот №18. Станок заточной 3 А64 (инвентарный №1556). Начальная цена: 3 170 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 317 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 158 500 бел. руб.

Торги состоятся **28.09.2015 г. в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в КУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в КУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах: **с 26.08.2015 с 8.30 по 25.09.2015 г. до 17.30.**

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Сумма задатка перечисляется на р/с 3012010512470 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700049385. Получатель платежа: ОАО «Кожевник». Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. С МБП и компьютерной техникой можно ознакомиться по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137. **Контактный тел. (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.022. Нумар падпісаны ў 19.30 25 жніўня 2015 года.

ПАВЕЛ СУХОЙ: ЗВЫШГУКАВАЯ СЛАВА,

або Шлях ад гомельскага гімназіста да авіяканструктара, які лепш за іншых бачыў будучыню

У 1903—1908 гадах у свеце пачаўся «авіябум». Браты Уілбур і Орвіл Райт, прадпрымальныя амерыканцы, якія першымі ўзнялі ў паветра лятальны апарат, здзейснілі сапраўдную рэвалюцыю ў гісторыі чалавецтва. У 1908 годзе яны прыехалі ў Парыж і ўстанавілі там першыя сусветныя рэкорды на аэрапланах: працягласць палёту — 2 гадзіны 20 хвілін, далёкасць — 50 км, максімальная вышыня ўздыму — 110 м.

Царская Расія жыла тым часам іншымі праблемамі. Толькі што закончылася ганебная вайна на Далёкім Усходзе з японцамі, па ўсёй краіне пракаціліся бунты, названыя пазней Першай рускай рэвалюцыяй. Імперыя літаральна ўзнялася на дыбы: было зразумела, што жыць так, як раней, ужо нельга, патрэбен рывок — не конь і плуг пацягнуць наперад краіну, а навука і прагрэс у вытворчасці. Пачыналіся нябачаныя раней пераўтварэнні ўрада Сталыпіна — і ў горадзе, і ў вёсцы... І тут галоўным было — не дапусціць развалу патрыярхальнай краіны, пусціць яе ў ход спакойна, абдумана, прадказальна. Патрабаваліся адпаведныя кадры. Ва ўсіх сферах жыццядзейнасці дзяржавы.

...Любы аўтар, пішучы пра якую-небудзь знакамітасць, заўсёды хоча знайсці першыя сведчанні таленту свайго героя ў яго дзяцінстве. З кімсьці гэта ўдаецца зрабіць без праблем. А з некім (гэта ў большасці выпадкаў) бываюць цяжкасці. Скажам, у дзяцінстве ў сына вясковага настаўніка Паўла Восіпавіча Сухога, які з'явіўся на свет 10 ліпеня (22-га па новым стылі) 1895 года, ніякіх прыкмет будучай геніяльнасці не знайсці. Што, зрэшты, не так ужо і важна. Значна важней тое, наколькі ўпартым і ў той жа час летуценным быў наш герой. Таму што геній — гэта, як казаў вынаходнік Томас Эдысан, адзін працэнт натхнення і дзевяноста дзевяць працэнтаў поту.

ПАВЕЛ Сухой нарадзіўся ў мястэчку Глыбокае Дзісенскага павета Віленскай губерні. Яго дзед, Андрэй Аляксеевіч Сухі, быў прыгонным селянінам у памешчыка Гіцэвіча ў маёнтку Вязынь, але з маладых гадоў вызначаўся кемлівым розумам і руплівасцю ў працы, за што Гіцэвіч адправіў яго вучыцца ў Чарнігаўскую школу пчаляроў, якую ён скончыў у 1837 годзе. Бацька, Восіп Андрэевіч, маючы таксама выдатныя здольнасці да навукі, скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю і ўсё жыццё прапрацаваў настаўнікам. Ажаніўся ён са сваёй зямлячкай Кацярынай Якаўлеўнай Гісіч, якая нарадзіла яму пяцярых дзяцей — чатырох дзяўчынак і аднаго хлопчыка — Паўла. Іх усіх выхоўвалі ў праваслаўных традыцыях, вучылі музыцы. Вялікай папулярнасцю ў сям'і карыстаўся хатні рукапісны часопіс «Молодая поросль», куды можна было запісаць сачыненне, верш, пажаданне. У Восіпа Андрэевіча была вялікая бібліятэка, але адну кнігу асабліва шанавалі. Гэта быў томік першых вершаў Якуба Коласа з асабістым аўтографам аўтара: «Паважанай Лізавеце Якаўлеўне на памяць ад аўтара».

Тут хацелася б зрабіць невялікае адступленне і прывесці цытату з размовы Паўла Восіпавіча з яго калегам-авіяканструктарам Алегам Сяргеевічам Самайловічам:

> *«Маё сапраўднае прозвішча не Сухой, а Сухі (націск на апошнім складзе). Мы абодва з вамі беларусы, і толькі таму я вам гэта расказваю. Калі я нарадзіўся і мне давалі ў царкве імя, дзяк аб'явіў, што ён не ведае такога прозвішча — Сухі, таму ў дзіцяці будзе прозвішча Сухой. Вось такая гісторыя».*

У 1900 годзе Восіпу Андрэевічу прапанавалі загадваць школай у Гомелі, і ўся вялікая сям'я перабралася ў горад на Сожы — даволі буйны прамысловы цэнтр. Тут выходзяць газеты, працуюць тэатры, шмат аб чым гаворыць народ на вуліцы, у лаўках, на рынку. Павел, як і ўсе, напэўна, хлопчыкі яго ўзросту (хто меў магчымасць), з захапленнем чытае артыкулы аб авіяцыі і лётчыках, разглядае фатаграфіі і малюнкі лятальных апаратаў, але авіяцыя яшчэ не становіцца яго запалам, патрэбай жыцця. Можа быць, адной з прычын гэтага з'яўляецца тое, што яго бацькі і сёстры больш цікавяцца навінкамі літаратуры і мастацтва, чым тэхнікі.

Праз шмат гадоў Павел Восіпавіч адзначыць, што самым моцным уражаннем дзіцячых гадоў, якое вызначыла яго лёс, была непасрэдная сустрэча з авіяцыяй: ён назіраў за палётам Сяргея Утачкіна, які тады гастраляваў, калі можна так сказаць, па розных гарадах Расіі. Тая першая сустрэча з самалётам — гэта быў «Фарман» — пакінула ў жыцці гімназіста Сухога незвычайна глыбокі след. Вось як ён сам успамінаў пра яе:

> *«Мы спыніліся, вуркатанне даносілася з неба. Мы тады ўжо ведалі пра існаванне самалётаў і таму адразу вырашылі, што ў паветры не што іншае, як самалёт. А вось і ён паказаўся з-за даху гарадской управы. Самалёт ляцеў нізка, і мы добра бачылі яго абрысы. Лётчык сядзеў пад верхнім крылом у атачэнні незлічоных рэек і тросаў. Хваставое апярэнне было такім вялікім, што мы з цяжкасцю вызначылі, дзе нос, а дзе хвост самалёта... Вось ён праляцеў над горадам і схаваўся за цёмна-сіняй паласой лесу, а мы ўсё стаялі як зачараваныя і глядзелі ў яго бок. У вушах яшчэ чулася стракатанне рухавіка. З таго часу самалёт трывала ўвайшоў у маю свядомасць, я часта думаў пра людзей, якія на іх лётаюць і якія іх будуюць».*

І першае, што гімназіст Сухой зрабіў, прыйшоўшы дадому, — гэта забраўся на гарышча і пачаў майстраваць уласную мадэль аэраплана. На жаль, узляцець яна не здолела: у малога «канструктара» не было ні ведаў, ні вопыту, ні ўяўленняў аб тым, як менавіта лятаюць самалёты. Што ж, недахоп інфармацыі ніколі ні да таго, ні асабліва пасля Сухога не спыняў. Калі табе нешта невядома, значыць, пра гэта трэба даведацца як мага больш! І будучы авіяканструктар пачынае чытаць аб авіяцыі ўсё, што толькі можа знайсці ў Гомелі. Ён стаў уважліва прыглядацца да фатаграфій аэрапланаў, шукаць газеты, часопісы і кнігі, дзе можна было запазычыць хоць што-небудзь новае. А калі ў рукі аднойчы трапіў артыкул «бацькі рускай авіяцыі» М. Я. Жукоўскага, выкладчыка Імператарскага тэхнічнага вучылішча ў Маскве, ён па-сапраўднаму «захварэў» авіяцыяй і ўжо жадаў сам канструяваць і будаваць самалёты.

Ужніўні 1914 года пачалася Вялікая Еўрапейская вайна, у якой на ўвесь голас заявіў пра сябе новы род войск — ваенная авіяцыя. Паветраны флот Расіі па колькасці баявых самалётаў перад пачаткам вайны быў шматлікім. Ён налічваў 250 самалётаў. Але якіх-небудзь істотных пераваг рускай арміі гэта не прынесла. Большасць аэрапланаў была састарэлых канструкцый і «замежнага паходжання», без дастатковага забеспячэння запаснымі часткамі. Толькі 20% паветранага флоту Расіі складалі айчынныя самалёты, сярод якіх вылучаўся «Ілья Мурамец» кіеўскага канструктара Ігара Сікорскага. У 1914-м Паўла Сухога на фронт не ўзялі — не дасягнуў прызыўнога ўзросту. Павел вырашыў: прыйшоў час штурмаваць маскоўскае тэхнічнае вучылішча. І як толькі гімназічны атэстат апынуўся ў яго на руках, бацька тут жа перадаў усе неабходныя для паступлення дакументы свайму маскоўскаму свяку. І хто б ведаў, што той, баючыся страціць паперы, здаў у прыёмную камісію не арыгіналы, а копіі! Менавіта на гэтай падставе Сухому і адмовілі ў прыёме. У выніку ён у 1914 годзе стаў студэнтам іншай легендарнай ВНУ — Маскоўскага ўніверсітэта (быў залічаны на першы курс матэматычнага факультэта).

Але ўсе думкі Сухога звернуты да тэхнічнага вучылішча, і на наступны год ён робіць новую спробу, на гэты раз — удалую.

Цяпер Павел слухае лекцыі свайго любімага прафесара Жукоўскага і займаецца ў яго гуртку паветраплавання: будуе планёры і мадэлі самалётаў. Гурток, акрамя яго, наведваюць такія вядомыя ў будучыні канструктары, як Андрэй Тупалеў, браты Архангельскія, браты Пагоскія, Уладзімір Петлякоў, Барыс Сцечкін. Усяго год займаўся Павел у гуртку Жукоўскага. Яго прызываюць на ваенную службу, і пасля заканчэння школы прапаршчыкаў ён ідзе на фронт. Служыць Павел Восіпавіч у... артылерыі. Менавіта тут, на фронце, ён усвядоміў, якую велізарную ролю ў бітвах адыгрывае ваенная авіяцыя: бачыў, як «Ілья Мурамец» бамбіў нямецкія пазіцыі і знішчыў некалькі варожых батарэй, назіраў за жорсткім боем рускага лётчыка на французскім «Маране» з немцам на «Альбатросе», ведаў, што камандаванне часта выкарыстоўвае даныя паветранай разведкі.


СВИДѢТЕЛЬСТВО.

По указу Его ИМПЕРАТОРСКАГО ВЕЛИЧЕСТВА САМОДЕРЖЦА ВСЕРОССІЙСКАГО, Литовская Духовная Консисторія, согласно опредѣленію своему, выдала настоящее свидѣтельство въ томъ, что въ метрической книгѣ Глубокской церкви Дисненскаго уѣзда, за 1895 годъ, въ 1 части о рожденныхъ, въ стр. 117 мужескаго пола, записана слѣдующая запись: „тысяча восемьсотъ девятаго пятаго года декабря 30-го дня рождёнъ, и трёхъ-дневно крещенъ Павелъ. Родители его: законные Глубокскаго народнаго училища Осипъ Андреевъ Сухой и законная жена Елисавета Яковлева, оба православнаго исповѣданія. Восприемниками были: Глубокской церкви Священникъ Николай Зосимовъ, Никольскій и крестьянка сего Глубокаго Наталія Яковлева Пясецкая. Таинство крещенія совершилъ Священникъ Іоаннъ Виленскій, и уставное Великокняжеское Литовское Привилегіи и гербовый сборъ сполна. Б. Вилно Февраля 17 дня 1903 года.

Членъ Консисторіи Протоіерей Евгеній Ев...

Секретарь Сав...

Пасведчанне аб нараджэнні і хрышчэнні П. Сухога ў царкве Глыбокага.

Можна сказаць, што ў гэты момант ён выйшаў на старт свайго будучага «палёту». Ваенная кар'ера мала вабіла артылерыйскага афіцэра. І пасля заключэння Брэсцкага міру прапаршчык Сухой без шкадавання пакідае сваю часць і вяртаецца ў Маскву: жадае працягваць вучобу ў тэхнічным вучылішчы. Але тое зачынена пасля рэвалюцыі, і невядома, калі адкрыецца. Таму Павел вырашае вярнуцца на радзіму, да бацькоў. Яму прапанавалі працу настаўніка матэматыкі ў горадзе Лунінцы, што непадалёк ад Брэст-Літоўска, і Павел з'язджае туды. Здабываючы ў навакольных вёсках прадукты, Павел захварэў на сыпны тыф, а потым перанёс шкарлятыну, якая дала ўскладненне на горла. Маючы добры слых і прыемны тэнар, у юнацтве ў коле сям'і Павел часам спяваў. Цяпер, пасля перанесенага захворвання, ён нават гаварыў прыглушана, з цяжкасцю. Можа быць, таму ў далейшым ён наогул адмоўчваўся ў кампаніі і праславіўся «маўчуном». З гэтай прычыны калегі па працы лічылі, што Павел Сухой «некалькі сухаваты» ў зносінах.

У 1920 годзе выйшла пастанова Савета Народных Камісараў аб вяртанні студэнтаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы, і Павел паехаў у Маскву працягваць вучобу. Ён пасяліўся ў студэнцкім інтэрнаце. Памяшканне было маленькае, а студэнтаў, якія не мелі «даху над галавой», шмат. Некаторым даводзілася спаць наўпрост на падлозе. У 1923 годзе Павел Восіпавіч ажаніўся з выкладчыцай французскай мовы лунінецкай школы Соф'яй Феліксаўнай Цянчынскай. Яна пасля ад'езду Паўла засталася ў Гомелі і працавала ў школе, а потым таксама адправілася ў Маскву дапамагаць аўдавелай сястры. У Маскве Соф'я Феліксаўна паступіла на працу ў толькі што створаны Інстытут фізкультуры — выкладчыцай замежнай мовы. Выпадкова яны сустрэліся на вуліцы і больш не расставаліся ўжо ўсё жыццё. Жылі ў маленькім пакойчыку. Тут у іх нарадзілася дачка Ірына.

Упачатку 1924-га, яшчэ не скончыўшы тэхнічнае вучылішча, Павел Восіпавіч ўладкоўваецца чарцёжнікам у Эксперыментальны аэрадынамічны аддзел Цэнтральнага аэрагідрадынамічнага інстытута — славутага ЦАГІ. У тым жа годзе ён пачынае працу над дыпломным праектам. Яго кіраўніком прызначаюць Андрэя Мікалаевіча Тупалева. Абарона дыплома прайшла паспяхова. У пасведчанні аб заканчэнні МВТВ запісана: «У сакавіку 1925 года П.В. Сухой падвергнуўся выпрабаванням у Дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі і абараніў працу на тэму: «Аднамесны знішчальнік з маторам 300 к.с.». П.В. Сухому прысвойваецца кваліфікацыя інжынера-механіка». Тупалеў высока ацаніў здольнасці свайго дыпломніка і запрасіў яго на працу ў канструктарскі аддзел ЦАГІ. Так спраўдзілася мара Паўла Восіпавіча: ён пачаў працаваць у брыгадзе паплечніка А. М. Тупалева, А. М. Пуцілава у якасці інжынера-канструктара.

Авіяцыйны аддзел ЦАГІ адразу выступіў з наватарскіх пазіцый у айчынным самалётабудаванні — яго супрацоўнікі першымі ў СССР выказаліся за стварэнне суцэльнаметалічных самалётаў. Спачатку быў выпушчаны АНТ-1 змешанай канструкцыі, потым АНТ-2 — суцэльнаметалічны. Далейшую распрацоўку ідэй, закладзеных у АНТ-2, Тупалеў даручыў брыгадзе маладога інжынера-канструктара Паўла Сухога і паставіў перад імі нялёгкую задачу — стварыць першы суцэльнаметалічны знішчальнік для серыйнай вытворчасці, які б па сваіх даных пераўзыходзіў найлепшыя замежныя аналагі. І вось першы вытворчы іспыт. Да 1927 года быў пабудаваны новы самалёт І-4, які быў тэхнічна просты, але ў той жа час меў шматлікія навінкі, сярод якіх была рама незвычайнай канструкцыі, спраектаваная асабіста Паўлам Восіпавічам. Першыя палёты паказалі, што па максімальнай хуткасці, вышыні пад'ёму, хуткапад'ёмнасці І-4 апярэджвае многія замежныя знішчальнікі, а па манеўранасці яму роўных няма. Гэты самалёт стаяў на ўзбраенні Чырвонай Арміі з 1928 па 1933 год. Брыгада ж Сухога тым часам атрымала заданне на праектаванне новага аднаместнага знішчальніка І-14. У канструкцыю самалёта Павел Восіпавіч прапанаваў увесці цэлы арсенал тэхнічных навінак: прыбіраемае ў палёце шасі, маслена-пнеўматычную амартызацыю, тармазную сістэму колаў, ліхтар, які заслоніць кабіну лётчыка, гладкую ашалёўку фюзеляжа. Андрэй Мікалаевіч Тупалеў ухваліў гэтыя ідэі. Май 1933 года. На цэнтральным аэрадроме ЦАГІ лётчык В. Л. Бухгольц падымае ў паветра новы знішчальнік. Лётныя даныя выдатныя. Знішчальнік рэкамендавалі для серыйнай вытворчасці. У вытворчасці знаходзілася 55 машын, але выпусцілі толькі 18, таму што ў краіне не хапала алюмінію.

Але неўзабаве жыццё Сухога ўзрушыла новае вялікае заданне: яму даручаюць прыняць удзел у стварэнні самалёта РД — «рэкорд далёкасці», сама назва яго гаворыць пра многае: самалёт нацэльваўся на першы сусветны рэкорд у гісторыі маладой савецкай авіяцыі. Біяграфія гэтай машыны пачалася ў снежні 1931 года. Работамі кіраваў Сухой, але агульнае кіраўніцтва ажыццяўляў Тупалеў. Размах крыла новай машыны — 34 метры, даўжыня яго перавышала шырыню ў 13 разоў! Крылы РД мелі і яшчэ адну прынцыповую асаблівасць: гіганцкія бензінавыя бакі, кожны даўжынёй па сем метраў, з'яўляліся як бы арганічнай часткай канструкцыі. Размешчаныя ўздоўж усяго крыла, яны, акрамя ўсяго іншага, давалі вялікі выйгрыш у трываласці.

Павел Сухой — студэнт МВТУ, 1921.

Стварэнне крыла такога тыпу склала цэлую частку ў гісторыі самалётабудавання. Выкарыстоўвалася таксама новае аэранавігацыйнае абсталяванне. Праектаванне самалёта было скончана праз паўгода, і ў чэрвені 1932-га пачалася пабудова доследнага экзэмпляра. Праз год АНТ-25 быў гатовы для лётных выпрабаванняў. Самалёт быў адобраны, цяпер выбіраўся маршрут, якім ляцець. Спыніліся на трасе, якая праходзіць праз Паўночны полюс і Амерыку. У сувязі з гэтым быў унесены шэраг змен: пастаўлены новы руль, элероны, з'явілася прыстасаванне для ацяплення кабіны выхлапнымі газамі. Пасля ўсіх даводак выпрабавальнікі адзначылі: машына гатова да пералёту. З 18 па 20 чэрвеня 1935 года экіпаж В. Чкалава, а з 12 па 14 ліпеня экіпаж М. Громава здзейснілі беспасадачны пералёт праз Паўночны полюс у ЗША, прайшоўшы больш за 10 000 км. За стварэнне самалёта РД П. В. Сухой быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

